ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 8 (2794) • Пятніца, 20 лютага 1976 г. • Цана 8 кап.

Мы з Леніным крочым наперад! Мы з партыяй нашай ідзём!

Пятрусь БРОЎКА.

На пульце кіравання энергаблока № 2 Лукомльскай ДРЭС.

Ударнік дзевятай пяцігодкі матальшчыца Брэсцкага панчошнага камбіната Вера Рачко.



Навуковыя супрацоўнікі лабараторыі тэрмаэрадынамікі Інстытута цепла- і масаабмену Акадэміі навук БССР А. Чакольскі і К. Лазоўскі праводзяць чаргозы эксперымент.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

Амаль 20 гадоў працуе ў гарачым цэху Мінскага камбіната будаўнічых матэрыялаў камуніст Міналай Карпавіч Ільін. На прадпрыемстве ён зарэкамендаваў сябе не толькі выдатным працаўніком, але і актыўным змагаром за новае, перадавое.

На Мінскай абласной партыйнай канферэнцыі М. К. Ільін выбраны дэлегатам на XXV з'езд КПСС.

На здымку—М. К. Ільін.

Фота І. ЗМІТРОВІЧА. БЕЛТА.

Сапраўдным майстрам земляробства зарэкамендаваў сябе механізатар саўгаса імя Калініна Краснапольскага раёна Герой Сацыялістычнай Працы Юлій Ягоравіч Жлоба. Вось ужо некалькі гадоў на землях з невысокім натуральным пладароддзем яго звяно атрымлівае самыя высокія ўраджаі на Магілёўшчыне.

Механізатар - звеннявы Ю. Жлоба выбран дэлегатам на XXV з'езд КПСС.

На здымку — Ю. Жлоба.

Фота В. БЫСАВА.

З ПАРТЫЯЙ—СЭРЦЫ, З ПАРТЫЯЙ—ДУМЫ

ДНІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА ГРОДЗЕНШЫНЕ

ПРЫНЯМОННЕ... Яно памятае кроні Адама Міцкевіча, а старыя вулачкі Гродна шмат могуць расказаць пра Элізу Ажэшка. Слова тут было зброяй у барацьбе за светлы дзень. Гэты край апяваў Міхась Васілёк, шчырыя, прачулыя вершы прысвячае яму Ніна Тарас. Тут, сярод раздольных прастораў, на беразе хуткаплыннага Нёмана мацнее, шчадрэе талент лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Васіля Быкава.

Можна назваць яшчэ шмат прозвішчаў мастакоў слова розных пакаленняў, для якіх зямля гэтая родная, а людзі блізкія. У творах пісьменнікаў гучыць натхнёная песня савецкай рэчаіснасці, а ў цэнтры кожнага з іх адзін герой — наш сучаснік. Хлебароб і рабочы, настаўнік, студэнт, воін Савецкай Арміі.

Сёння Прынямоннe надзвычай святочнае. Як і ўся Беларусь, яно жыве чаканнем чарговага форуму камуністаў Краіны Саветаў. Штодзённыя справы чырвонымі радкамі ўпісваюцца ў рапарт XXV з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Свята гэтае тым больш радаснае, што цяпер тут праходзяць Дні беларускай літаратуры. Дэвіз іх—«Натхнёнае слова пісьменніка—XXV з'езду КПСС».

Пяць дзён, дзесяткі сустрэч, сотні новых знаёмстваў. І новыя вершы, якія пісаліся часам тут жа, на месцы, бо тэмы іх падказвалі гэтыя ж сустрэчы.

У складзе дэлегацыі, якая знаходзіцца на Гродзеншчыне, Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Анатоль Грачанікаў, Уладзімір Гніламёдаў, Алег Лойка, Еўдакія Лось і іншыя пісьменнікі — усяго каля трыццаці чалавек. Выступленні літаратараў, сустрэчы з працоўнымі адбыліся ва ўсіх раёнах вобласці. Пісьменнікі выступалі ў складзе пяці груп. Вось толькі некаторыя маршруты.

У працаўнікоў Воранаўскага, Лідскага і Шчучынскага раёна пабывалі Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Павел Місько.

Хлебаробы Слонімскага, Зэльвенскага, Мастоўскага раёнаў сваімі поспехамі дзяліліся з Алесем Асіпенкам, Аляксеем Карпюком, Алегам Лойкам, Уладзімірам Паўлавым, Давідам Сімановічам.

Сустрэчы... Каб перадаць радасную, сардэчную атмасферу іх, патрэбна пабываць на кожнай, і толькі тады можна уявіць, як людзі любяць літаратуру, наколькі ўважлівыя яны да пісьменніцкага слова.

У блакнотах гасцей з'явілася шмат цікавых занатовак, прозвішчаў. Гэта адрасы з пярэдняга краю, адтуль, дзе поўным ходам ужо разгарнулася барацьба за выкананне планаў першага года дзесятай пяцігодкі, пяцігодкі якасці.

А якасць патрэбна ўсюды. У літаратуры таксама, бо народ чакае высокамастацкіх твораў пра наш час, пра чалавека працы — пра тых, хто вырошчвае высокія ўраджаі, стварае новыя машыны.

«Прыязджайце да нас часцей» — словы гэтыя неаднойчы гучалі з вуснаў кіраўнікоў і хлебаробаў Карэліцкага раёна, які — адзін з эканамічна моцных у рэспубліцы. Летась тут паспяхова справіліся з выкананнем сацыялістычных абавязацельстваў і занялі першае месца ў вобласці. На Карэліцкай зямлі працуе нямала майстроў сваёй справы, і, безумоўна, першаму сакратару райкома партыі Аляксею Аляксандравічу Яновічу было пра што расказаць гасцям —Анатолю Грачанікаву, Петрусю Макалю, Казіміру Камейшу, Мар'яну Дуксу.

А ў кабінеце палітычнай асветы адбылася сустрэча з творчай інтэлігенцыяй горада. Тут жа былі супрацоўнікі раённай газеты «Полымя», члены літаратурнага аб'яднання «Рэчанька», якое працуе пры ёй. Свае вершы чыталі настаўнікі Генадзь Дзмітрыеў, Іван Жук, работніца райапа Галіна Калтунова, работнік метадычнага кабінета Іван Вярбіцкі. І, вядома, самі госці.

Потым завязалася шчырая гаворка аб роднай літаратуры, пісьменнікі выказалі свае думкі аб творах пачаткоўцаў.

Прайшлі таксама сустрэчы з вучнямі і педагогамі сярэдняй школы ў г. п. Мір, з хлебаробамі калгаса імя Чарняхоўскага. Тут у Палацы культуры адбыўся вялікі літаратурны вечар.

Жупраны... Тут магіла Францішка Багушэвіча, пісьменніка, які ў творах сваіх паказваў жыццё простага народа, верыў у яго будучыню. Людзі памятаюць свайго славутага земляка, любяць яго вершы, паэзію наогул.

З хлебам-соллю сустракалі яны і пісьменнікаў, што заехалі ў тутэйшыя мясціны, — Еўдакію Лось, Уладзіміра Гніламёдава, Язэпа Семяжона, Рыгора Семашкевіча, Юрку Голуба. Паездка гэтая па Ашмянскім раёне дала шмат новых знаёмстваў. Літаратары выступалі ў сельскагаспадарчым тэхнікуме, СПТВ-18, у калгасе «Свабода», перад школьнікамі і настаўнікамі горада.

З гэтай жа групай пісьменнікаў гутарыў першы сакратар Смаргонскага райкома партыі Аляксандр Мікалаевіч Патапаў. Потым —паездкі па раёне.

Як дарагую госцю, сустрэлі Еўдакію Лось хлебаробы калгаса «Праўда». У зале сабралася шмат жанчын і дзяўчат. Ім вельмі прыемна было паслухаць расказ любімай паэтэсы пра сваю творчасць, пачуць вершы ў яе выкананні. Былі і пытанні. Пра літаратуру, пра паэзію, пра асабістыя творчыя планы.

А Уладзімір Гніламёдаў і Язэп Семяжон з задавальненнем пазнаёміліся з рабочымі Смаргонскага завода сілікатных вырабаў, якія расказалі ім пра свае працоўныя справы, пра сваё прадпрыемства, выказалі пажаданне, каб з'яўлялася больш твораў пра рабочы клас рэспублікі, запрашалі літаратараў часцей прыязджаць.

Дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных касцюмах з хлебам-соллю сустрэлі Дануту Бічэль-Загнетаву, Мікалая Кругавых, Міколу Маляўку, Леаніда Прокшу, Кастуся Цвірку на мяжы Бераставіцкага раёна са Свіслацкім. Гасцей віталі старшыня калгаса «Авангард» Бераставіцкага раёна Франц Антонавіч Маркоўскі, сакратар партыйнай арганізацыі гаспадаркі Віктар Аляксандравіч Столік.

Адбылася сустрэча ў Бераставіцкім райкоме партыі.

З поспехам прайшлі выступленні пісьменнікаў у Вялікабераставіцкай сярэдняй школе імя С. В. Прытыцкага і ў Палацы культуры ордэна Леніна калгаса імя Варанецкага.

Сёння на вялікі літаратурны вечар у горадзе Гродна збяруцца рабочыя, прадстаўнікі інтэлігенцыі, студэнты. Ён падагульніць Дні беларускай літаратуры, што прайшлі ў Прынёманскім краі.

Пісьменнікі робяць творчую справаздачу перад чытачамі, яны рапартуюць аб сваіх справах XXV з'езду КПСС.

Генадзь Бураўкін, Васіль Быкаў у Лідскім краязнаўчым музеі. Фота Ул. КРУКА.

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ БССР

13 лютага адбыўся арганізацыйны пленум праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР. Першым сакратаром праўлення выбраны кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі В. Т. Тураў, сакратарамі — кінарэжысёры Ю. В. Лысятаў, В. А. Нікіфараў і заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В. П. Чацверыкоў.

Старшынёй рэвізійнай камісіі Саюза кінематаграфістаў БССР выбраны кінааператар В. А. Арлоў.

АБМЕРКАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ

Днямі ў Саюзе пісьменнікаў СССР адбылося пасяджэнне Савета па беларускай літаратуры. Яго адкрыў сакратар праўлення СП СССР Ю. Верчанка. На пасяджэнні было абмеркавана пытанне аб стане сучаснай беларускай прозы. З уступным словам на гэту тэму выступіў старшыня Савета А. Аўчарэнка. У рабоце пасяджэння ўдзельнічалі літаратары нашай рэспублікі І. Чыгрынаў, У. Гніламёдаў, А. Адамовіч, В. Адамчык, А. Асіпенка, М. Лобан, Н. Пашкевіч, П. Місько, В. Каваленка, А. Капусцін. Справаздача аб пасяджэнні Савета будзе надрукавана ў адным з бліжэйшых нумароў.

СЛОВА, ЯКОЕ ПРАЦУЕ

СЁННЯ, бадай, нікога не дзівіць тое, што вечарамі сотні людзей накіроўваюцца ў тэатры, канцэртныя залы, іншыя месцы культурнага адпачынку. Не ўпершыню прымае сваіх шматлікіх наведвальнікаў і Палац культуры Мінскага аўтазавода. На гэты раз у яго прасторную глядзельную залу прыйшлі працоўныя Заводскага раёна сталіцы не на відовішча, не на канцэрт славутых зорак эстрады. Іх, майстроў сваёй справы, прывабіла сюды імя і справа майстра з літаратурнага цэха. Тут меўся адбыцца творчы вечар народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, прысвечаны XXV з'езду КПСС.

Ці варта гаварыць, які шырокі кругагляд, якія вялікія духоўныя запатрабаванні ў нашых савецкіх рабочых і тэхнічнай інтэлігенцыі. Доўгая чарга каля кніжнага кіёска ў фае, прыўзняты настрой людзей, жывая рэакцыя на выступленні як нельга лепш сведчылі пра тое, што рабочы чалавек жыве не хлебам адзіным. Ён, само сабой зразумела, дасведчаны ў тэхніцы, ён у курсе дасягненняў навукі, выдатна разбіраецца ў пытаннях эканомікі і палітыкі. Чытае рабочы і мастацкую літаратуру, але, як гэта заўважана даўно, рашуча не прызнае дрэнных, нізкаякасных твораў. Яму патрэбна мастацкае слова, якое б узбагачала яго духоўна і працавала б з ім ля станка. Таму з поўным адабрэннем і згодай сустрэлі прысутныя сказанае ад іх імя першым сакратаром Заводскага райкома партыі А. Б. Зуевым аб тым, што працоўныя раёна добра ведаюць і любяць творчасць Івана Шамякіна. Было падкрэслена, што беларускія пісьменнікі ўносяць свой дастойны ўклад у будаўніцтва камунізму ў нашай краіне.

Чытачы і прыхільнікі таленту пісьменніка з асяроддзя слаўнага рабочага класа рэспублікі на тым вечары яшчэ бліжэй пазнаёміліся з яго жыццём і творчасцю. Пра дасягненні беларускай савецкай літаратуры і месца, якое займае ў ёй І. Шамякін, гаварыў А. Грачанікаў. Ён, перафразіраваўшы назву вядомага твора пісьменніка, параўнаў яго творчасць з глыбокай плынню, якая робіць нас чысцейшымі, мудрэйшымі, дапамагае нам глыбей пазнаць свет і саміх сябе.

В. Мыслівец успамінаў, якое ўражанне на яго асабіста і ўсіх вучняў у школе, дзе ён вучыўся, зрабіў той жа раман «Глыбокая плынь».

І. Навуменка расказваў пра жыццёвы шлях і творчасць пісьменніка, папулярна характарызаваў асаблівасці яго стылю і творчай манеры, гаварыў пра ўласцівае яму вострае пачуццё сучаснасці.

У зале настала вясёлае ажыўленне, калі заслужаная артыстка рэспублікі Ганна Рыжкова чытала фельетон І. Шамякіна «Падмочаны». І наадварот, з напружанай увагай слухалі прысутныя драматычныя ўрыўкі з яго новых аповесцей — «Шлюбная ноч» і «Гандлярка і паэт» — у выкананні заслужаных артыстак БССР Рымы Маленчанкі і Марыі Захарэвіч, урывак з рамана «Сэрца на далоні», які прачытаў народны артыст СССР Леанід Рахленка.

Па запрашэнню вядучай, дыктара Беларускага тэлебачання Зінаіды Бандарэнкі на сцэну ўзыходзяць чытачы — Герой Сацыялістычнай Працы Р. К. Прусава, У. К. Тукаеў, Ф. Р. Якіменка. Яны адказваюць на пытанні анкеты па творчасці І. Шамякіна, дзеляцца ўражаннямі і думкамі аб прачытаных кнігах.

У зале гучыць музыка, песні ў выкананні вядомых артыстаў беларускай эстрады і оперы — Вольгі Шутавай, Аркадзя Саўчанкі, Віктара Чарнабаева, Валерыя Кучынскага.

Ад маладых чытачоў, камсамольцаў раёна пранікнёнае слова прызнання і ўдзячнасці пісьменніку сказаў токар Мінскага трактарнага завода Мікалай Няверка. «Мы ўдзячны вам за нялёгкую і высакародную пісьменніцкую працу, якая ўплывае на лёс многіх людзей», — закончыў сваё выступленне малады рабочы.

Горача прынялі прысутныя выступленне Івана Шамякіна. Ён успомніў, як трыццаць гадоў назад у трывожнай ваеннай абстаноўцы пад Мурманскам таварышы па зброі, камуністы прымалі яго ў рады партыі. «Я выхаваны партыяй і камсамолам», — падкрэсліў пісьменнік і заверыў усіх, што і надалей будзе аддаваць усе свае сілы справе партыі, выхаванню новага чалавека, будзе імкнуцца паказаць у сваіх новых творах усё высакародства душы савецкага чалавека, яго маральную чысціню. Ён падзяліўся з чытачамі творчымі планамі, сказаў, што мае намер напісаць раман пра рабочы клас рэспублікі, што пачаў ужо збіраць матэрыял.

У заключэнне гэтага цікавага і карыснага вечара артысты Рэспубліканскага тэатра юнага гледача паказалі спектакль па п'есе І. Шамякіна «Экзамен на восень».

Ул. АНІСКОВІЧ.

СПЕЎ КРЫНІЧНАЙ ЧЫСЦІНІ

Імя народнай артысткі СССР Тамары Ніжнікавай вядома тысячам прыхільнікаў вакальнага мастацтва. У сцэнічнай гісторыі такіх буйных твораў опернай класікі, як «Іван Сусанін» М. Глінкі, «Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава, «Страшны двор» С. Манюшкі, «Севільскі цырульнік» Дж. Расіні, «Лакме» Л. Дэліба, яе выкананне галоўных партый пакідае яркі след. Яна выступае першым інтэрпрэтатарам музыкі для сцэны беларускіх сучасных кампазітараў (дастаткова прыгадаць хоць бы Марынку ў аднайменнай оперы Р. Пукста або Марфачку ў новай рэдакцыі «Дзяўчыны з Палесся» Я. Цікоцкага). У яе манеры выканання заўсёды раскрываюцца хараство жаночых характараў, напал сапраўды вялікіх пачуццяў, трапяткая прага шчасця гераінь.

Ведаюць Т. Ніжнікаву і замежныя слухачы. Ёй апладзіравалі ў Польшчы, Венгрыі, Румыніі, Аўстрыі, Фінляндыі... Прэса звычайна падкрэслівае высокую тэхніку і чыстату тэмбру гэтага чароўнага каларатурнага сапрана.

Артыстка спалучае сцэнічную дзейнасць з педагогікай і з канцэртнымі выступленнямі. І тут, гартаючы старонкі рамансавай літаратуры, зноў звяртаючыся да оперных партый, спявачка радуе самастойным прачытаннем вядомых узораў, свежасцю трактовак.

Так было і на камерным канцэрце, які Т. Ніжнікава разам з лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу вакалістаў Леанідам Івашковым далі ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага. У сольных нумарах і ў дуэтах прагучалі творы Шуберта, Шумана, Бізэ, Вердзі. Акампаніравала канцэртмайстар Лізавета Івашкова.

І на гэты раз Т. Ніжнікава прадэманстравала адточанасць кожнага нумару, высокую ступень прафесіяналізму, што адчувалася і ў агульнай канцэпцыі мастацкіх вобразаў, і ў багатай нюансіроўцы. Разнастайныя эмацыянальныя фарбы, як заўсёды, пакідалі ўражанне сваёй адпаведнасцю кампазітарскай задуме. Увесь канцэрт артыстка правяла з вялікім творчым уздымам. І слухачы зноў пераканаліся, што ў асобе Т. Ніжнікавай наша мастацтва мае спявачку, якая шануе лепшыя традыцыі рускай школы вакалу, што яна даражыць тымі ўрокамі хараства і ўмення, якія яна ўспрыняла ад такой выдатнай артыстычнай натуры, як Валерыя Барсава.

Леанід Івашкоў у апошнія канцэртныя сезоны значна пашырыў рэпертуарныя далягляды, шмат робіць для прапаганды сучаснай беларускай вакальнай музыкі. Яго ўдзел у вечары Т. Ніжнікавай засведчыў тонкае разуменне ім прыроды жанру і стылявых асаблівасцей музыкі, што выконваецца сёння.

Аўдыторыя добра прыняла выступленне артыстаў.

Б. ГУК.

Фота Ул. КРУКА.

Плакат мастака В. ФІЛІМОНАВА.

РОЗДУМ НАПЯРЭДАДНІ З'ЕЗДА

Іван НАВУМЕНКА

ГЕРОЙ, ЯКІ ЖЫВЕ ПОБАЧ З НАМІ

НАША літаратура стала новай з'явай у сусветным маштабе, ператварылася ў магутную сусветную літаратуру, літаратуру вялікага сацыяльнага аптымізму.

Кіруючыся вучэннем Маркса-Энгельса-Леніна, савецкія людзі будуюць новае жыццё, новы свет, і мы, пісьменнікі, кожны ў меру сваіх сіл, дапамагаем гэтаму — дапамагаем пераадольваць, зжываць сацыяльныя і духоўныя заганы, станавіцца

чалавеку ўсебакова развітай, багатай духоўна асобай. Літаратура спрыяла і спрыяе фарміраванню новага чалавека, героя нашага часу.

Савецкая літаратура паказала новага чалавека ў развіцці. Можна назваць цэлую галерэю вобразаў: Чапаеў, Левінсон, Давыдаў, дзед Талаш, Заслонаў, Антанюк, Сасноўскі і г. д. Варта падкрэсліць, што тут побач з чыста літаратурнымі імёнамі стаяць сапраўдныя, нявыдуманыя. Герой нашай літаратуры — гэта чалавек сацыялістычнага грамадства з новымі рысамі, якіх вымушана пазбаўлены чалавек дарэвалюцыйнага жыцця і сёння ў буржуазным грамадстве.

У нас новыя маральныя ўяўленні, новыя ідэйныя імкненні, зусім іншая шкала каштоўнасцей. Наша літаратура менавіта таму і з'яўляецца непаўторнай, самай перадавой, прагрэсіўнай літаратурай свету.

Сацыялістычнае жыццё — гэта перш за ўсё калектывы. Вёска, скажам, стала калгасам, саўгасам. На чале кожнага калектыву стаяць кіраўнікі, і яны павінны быць такімі, каб увасабляць найлепшыя якасці, весці за сабой людзей. І таму вобраз важака, арганізатара мас з першых крокаў савецкай літаратуры з'яўляецца ў ёй цэнтральным. Ад таго, хто гэты чалавек, якія яго маральныя, духоўныя якасці, у многім залежыць поспех справы.

Гэтае пытанне хвалявала Якуба Коласа, Кузьму Чорнага, Міхася Лынькова... Вырашае яго ў шэрагу сваіх твораў Іван Шамякін. У раманах «Сэрца на далоні», «Крыніцы» ён вядзе гутарку пра маральныя пазіцыі кіраўнікоў буйнага маштабу. Раманы «Снежныя зімы» і «Атланты і карыятыды» таксама прысвечаны гэтай праблеме. Скажам, у «Снежных зімах» маем вобраз Івана Васільевіча Антанюка, сталага кіраўніка, вельмі сумленнага і прынцыповага камуніста, які можа нават паступіцца сваім асабістым і службовым становішчам у імя вялікіх мэт і ідэалаў. Вобраз Антанюка паказаны ўсебакова. Гэта партызан, змагар, герой вайны і будаўнік мірнага жыцця, герой стваральнай працы, сем'янін і проста чалавек, які можа памыляцца, ад чаго вобраз ніяк не губляе сваёй прывабнасці, цікавасці.

У «Атлантах і карыятыдах» І. Шамякін як бы ўваходзіць у гушчу сучаснага індустрыяльнага жыцця і малое вельмі сімпатычны вобраз сакратара абкома партыі Сасноўскага ў процівагу сакратару гаркома Ігнатовічу, на погляд пісьменніка, чалавеку залішне «дзелавому», залішне меркантыльнаму. Ігнатовіч не ўлічвае многія чалавечыя якасці і фактары і таму церпіць фіяска.

Беларуская літаратура як літаратура новага сацыяльнага зместу пачынала з таго, што імкнулася намаляваць вобраз таго, хто ўзначальваў масы ў рэвалюцыі — вобраз арганізатара, кіраўніка — ці то непасрэдна ў рэвалюцыйным змаганні, ці то ў гарніле сацыялістычнага будаўніцтва.

Можна зноў жа прыгадаць раман М. Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі», аповесць З. Бядулі «Салавей», раманы К. Чорнага «Бацькаўшчына», «Траўня пакаленне», у якіх беларускія сяляне становяцца свядомымі змагарамі за сацыялістычнае жыццё, за перабудову жыцця на новых пачатках. Тое самае назіраецца і ў паэзіі.

Чым далей, тым часцей літаратура звярталася да вобразаў камуністаў. Ніводзін пісьменнік не можа абысціся без таго, каб не вывесці ў сваім творы такога вобраза. Вобразы камуністаў з'яўляюцца цэнтральнымі ў «Шэметах» М. Лобана, «Серадзіборы» П. Пестрака, у яго ж ранейшым рамане «Сустрэнемся на барыкадах», у творах іншых пісьменнікаў.

Сапраўды, нашу літаратуру без такога вобраза нават цяжка ўявіць сабе. Па самой сваёй сутнасці яна не можа не паказаць таго, хто ўзначальвае вялікія калектывы, а паколькі гутарка ідзе пра калектыў, дык і ўзнікае шэраг праблем: важак і масы, іх узаемадзеянне і г. д.

Вядома, што за апошнія дзесяць-пятнаццаць гадоў гэты вобраз перажыў поўныя змены, бо і ў жыцці адбыліся значныя сацыяльныя перамены, і былы вобраз кіраўніка «без сучка і задзірынкі» страціў сваю прывабнасць. Кіраўніцтва пачало вызначацца калегіяльнасцю, і станоўчы герой-арганізатар павінен мець не толькі цвёрды характар і цвёрдую волю, але павінен ўлічваць думку падначаленых, раіцца з імі, кіраваць масамі і вучыцца ў гэтых мас. Цяпер пісьменнікі пачалі смялей паказваць кіраўніка больш рознабакова. Сёння яны стараюцца зазірнуць і ў яго інтымнае жыццё, наглядзець, які ён у жыцці асабістым. Карацей кажучы, пашыраны чыста чалавечы аспект. І гэта я лічу заваёвай літаратуры.

Дарэчы, з гэтага даўно пачала наша літаратура. М. Шолахаў яшчэ да вайны ўбачыў новы тып кіраўніка, калі маляваў свайго Давыдава. Давыдаў, як памятаем, і памыляецца, і хістаецца, і робіць другія памылкі, але тым не меней застаецца чалавекам абаяльным, адданым ідэі.

Гэтая праблема хораша пастаўлена ў «Серадзіборы» П. Пестрака. Там ёсць два тыпы кіраўнікоў: Гугновіч, што рубіць з пляча, і Малашкін, які нават закахаўся ва ўласную сакратарку, і нічога кепскага з гэтага не здарылася. Малашкін — чалавек багаты духоўна, яму ўласцівы пэўныя чалавечыя слабасці, але гэта ніяк не азначае, што ён дрэнны кіраўнік.

За гады Савецкай улады беларуская літаратура не толькі параўналася з братнімі літаратурамі савецкіх рэспублік, але стала адным з лепшых атрадаў усесаюзнай літаратуры. Нашы раманісты, напрыклад, карыстаюцца самай шырокай папулярнасцю, пра што гаварылася на Усесаюзнай нарадзе пісьменнікаў і крытыкаў, што адбылася ў нашым горадзе-герої Мінску ў лютым-сакавіку 1975 года. Кнігі беларускіх пісьменнікаў ахвотна перакладаюць на рускую мову, імі захапляюцца ва ўсіх братніх саюзных рэспубліках, іх выдаюць за рубяжом. Сусветна вядомымі сталі не толькі Янка Купала і Якуб Колас, але і многія нашы сучаснікі. Дарэчы, у Злучаных Штатах Амерыкі аматары беларускай літаратуры паставілі помнік Янку Купалу побач з помнікамі іншым вялікім мастакам слова. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца творы К. Крапівы, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова, І. Шамякіна, В. Быкава, П. Панчанкі і іншых. Беларуская літаратура стала вельмі развітай, духоўна багатай, калі хочаце, нават вытанчанай. Нашы паэты падкрэсліваюць, заўважаюць самыя тонкія нюансы ў душэўным, унутраным жыцці чалавека і выяўляюць у інтымным жыцці людзей самае-самае трапяткое і паказваюць чалавека чалавекам сапраўды інтэлігентных адчуванняў, чалавекам новай фармацыі. Гэта мы назіраем і ў паэзіі, і ў прозе, і ў драматургіі, і ў літаратуразнаўстве.

Набыткі ёсць. Але наколькі творы, якія пішуцца і выдаюцца сёння, адпавядаюць сучаснасці, сучасным духоўным запатрабаванням чалавека, чалавека выхаванага, адукаванага? Трэба ўлічыць, што змянілася не толькі літаратура, але і чытачы. Сёння ўжо не тая чытацкая аўдыторыя, што была пяцьдзесят-сорак гадоў назад. І літаратура, калі яна хоча быць на ўзроўні часу, павінна ўлічваць гэтыя ўзросшыя запатрабаванні новага чытача, а інакш яе проста не будуць чытаць.

Наша жыццё імкліва змяняецца ў індустрыяльным напрамку; формы гарадскога жыцця распаўсюджваюцца на вёску, ідуць такія сацыяльныя працэсы, якія адбіваюцца на духоўным клімаце, на духоўным жыцці людзей, а гэтыя працэсы якраз і цікавяць літаратуру, і мы павінны сачыць за развіццём падзей, нават прадказваючы іх. Наша літаратура застаецца ў даўгу перад рабочымі і сялянамі. Мы яшчэ мала паказваем вялікія калектывы, якіх у нас вельмі шмат і яны ўвесь час растуць. У іх спецыфічны мікраклімат, які нам належыць вывучаць. А гэта ж цікавіць увогуле ўсю грамадскасць, усіх людзей.

Тыповасць станоўчага героя ўзрастае і патрабуе большай увагі да гераічнага, да праўдзівага, паглыбленага аналізу духоўнага і сацыяльна-палітычнага жыцця, псіхалогіі будаўніка новага свету, яго ідэйнай сталасці. Не выпадкова ў рашэннях мінулага XXIV з'езда нашай партыі падкрэслівалася ўзрастаючае значэнне літаратуры ў жыцці грамадства. Партыя заклікае мастакоў слова да высокай патрабавальнасці ў творчасці, да змагання за тое, каб на яшчэ больш высокі ўзровень узняць аўтарытэт чалавека працы.

Значыць, задачы перад савецкімі пісьменнікамі ўзрастаюць: маляваць вобразы людзей ва ўсёй складанасці іх духоўнага жыцця і праз іх унутраны свет, жаданні, мары, схільнасці, паказаць

СЛОВА БЯРЭ ЧЫТАЧ

ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ САПРАЎДНАЯ І ЎЯЎНАЯ

На XVII пленуме ЦК КПБ, які быў прысвечаны пытанням далейшага развіцця народнай асветы ў рэспубліцы, тав. П. М. Машэраў падкрэсліваў, што павышэнне ўзроўню навучальна-выхаваўчага працэсу патрабуе «...каб уся справа адукацыі і выхавання моладзі базіравалася на навейшых дасягненнях грамадскай думкі, педагогікі, навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэсу нашага грамадства». Гэта, безумоўна, тычыцца не толькі настаўнікаў, педагогаў, але і ўсіх, хто імкнецца даць моладзі глыбокія і ўсебаковыя веды, далучыць яе да сённяшніх дасягненняў навукі і тэхнікі,—я маю на ўвазе аўтараў разнастайных навукова-папулярных выданняў, па якія заўсёды быў вялікі попыт у масавага чытача.

У апошнія гады выдавецтвы рэспублікі («Ураджай», «Вышэйшая школа» і іншыя) выпусцілі шэраг добрых навукова-папулярных кніг, напісаных спецыялістамі. Узяць хоць бы кнігу Ул. Уладзіслаўскага «Чалавек—жывая крэпасць» («Вышэйшая школа»), якая, дарэчы, экспанавалася на міжнароднай выстаўцы «Кніга-75» у Маскве. Аўтар, па спецыяльнасці эпідэміёлаг, змог навукова дакладна і ў той жа час цікава і папулярна расказаць чытачам аб такой складанай з'яве, як імунітэт. Праўда, у гэтым выданні таксама можна знайсці тыя ці іншыя праліікі, напрыклад, пэўную аблегчанасць у падборы фактаў, іншы раз—жанглёрства імі, відаць, з мэтай уразіць чытача. Аднак у цэлым кніга «Чалавек — жывая крэпасць»—дасягненне папулярызатарскай літаратуры ў рэспубліцы.

А як жа абстаяць справы ўвогуле? У апошнія гады ўвага навукі, а таксама літаратуры, якая прызвана папулярызаваць яе дасягненні, усё больш настойліва скіроўваецца на самога чалавека, яго прыроду. Ва ўсесаюзных выдавецтвах па гэтыя тэмы выйшлі кнігі псіхіятраў, псіхолагаў, біёлагаў, антраполагаў, фізіёлагаў. А цяпер сюды далучыўся геолаг Р. Баландзін.

У кнізе «Час—Зямля—мозг» («Вышэйшая школа») ён расказвае пра тое, як узнікла жыццё на Зямлі, як з'явіўся і ўскладняўся галаўны мозг, чаму гэта унікальная з'ява адбылася менавіта на Зямлі і паказвае яго ўзаемасувязь з геалагічным лёсам планеты, знаёміць чытачоў з фактамі, здабытымі вучонымі розных галін прыродазнаўства, уводзіць іх у свет розных тэорый, гіпотэз і здагадак. Больш таго, аўтар сам жа праілюстраваў кнігу, у чым меў поспех: на XIV Рэспубліканскім конкурсе кніг па мастацка-тэхнічнаму афармленню і паліграфічнаму выкананню ён быў удастоены дыплома II ступені.

І ўсё ж кніга, як гаворыцца, «не чытаецца», хоць аўтар і абяцае не злоўжываць звычайнымі ўпрыгожаннямі папулярнага выкладання.

Гэта дзіўна, бо Р. Баландзін —аўтар цікавых кніг «Кроплі дэвонскага дажджу» і «Вачамі геолага» («Детская литература»), а таксама «Лёс Зямлі» («Ураджай»). Але факт застаецца фактам.

Прычыны няўдачы больш або менш праясняцца, калі ўспомніць, што Р. Баландзін яшчэ і аўтар кнігі «Планета набывае розум» («Навука і тэхніка»), якая папярэднічае гэтай—«Час —Зямля—мозг».

Каб лепш разабрацца ў «нечытабельнасці» некаторых навукова-папулярных выданняў, у тым ліку гэтай кнігі, што ўжо становіцца заканамернасцю, трэба зрабіць невялікае адступленне. Справа ў тым, як нам здаецца, што навукова-папулярная літаратура развіваецца бессістэмна, стыхійна. Некаторыя аўтары маюць вельмі недакладныя ўяўленні аб задачах папулярызацыі навукі.

Таму разам з навукова-папулярнымі кнігамі і брашурамі, разлічанымі на шырокага чытача, з'яўляюцца выданні, сярод іх і кніга «Час—Зямля—мозг», якія прызначаны «не столькі для шырокага чытача, колькі для спецыяліста-сумежніка». Ці не праўда, нават у самым вызначэнні гэтага «новага» напрамку папулярызацыі навукі, які зрабіў літаратуразнаўца В. І. Іваніцкі, крыецца штосьці нелагічнае, ненатуральнае. Усё ж такі «папулярны» — гэта агульнадаступны, шырока распаўсюджаны... Горш за ўсё, што гэтая «гульня ў хованкі» падтрымліваецца некаторымі вучонымі і выдаўцамі.

І хоць у названай кнізе ёсць цікавыя старонкі, аднак яны натапаюць у доўтіх разважаннях, запоўненых рознымі формуламі і тэрмінамі. Праўда, часам аўтар спрабуе растлумачыць некаторыя з іх, але падносіць чытачу вось такія фразы-рэбусы: «Мы вялім вкончание в мелу гершинского орогенического этапа и последующую

асаблівасці часу, эпохі, вядучыя тэндэнцыі жыцця.

Савецкі пісьменнік, кіруючыся ідэаламі партыйнасці, высокімі ідэаламі камунізму, усведамляючы тое, што Вялікі Кастрычнік разняволіў чалавека, раскуў яго творчыя сілы, што ўпершыню ў гісторыі працоўны чалавек стаў гаспадаром свайго жыцця, — ведаючы гэта, наш пісьменнік свядома ставіць свой талент на службу партыйнай, камуністычнай ідэі, і гэта натуральна, бо гэта справа яго сумлення, і ён лічыць гонарам для сябе служыць свайму народу, сваёй роднай партыі. Вельмі хораша сказаў Міхаіл Шолахаў, што ўсе пісьменнікі пішуць па закліку сэрца, а сэрца іх належыць партыі! У гэтым сэнсе партыйнасць сыходзіцца з паняццем —народнасць, бо партыя — перадавая частка народа, якая выражае яго глыбінныя інтарэсы, а народнасць пісьменніка азначае тое, што ён піша ў інтарэсах народа, дае з'явам народныя ацэнкі, з пункту гледжання народнай этыкі, маралі, якая складвалася ў асяроддзі працоўных людзей стагоддзямі. Народнасць — гэта не нешта знешняе. Працоўны народ жыў на нашай зямлі спрадвеку і выпрацаваў вельмі сталыя крытэрыі, сваю мараль, этыку, эстэтыку. І гэтага фактара не можа не ўлічваць літаратура, літаратура дэмакратычная, літаратура сацыялістычнага рэалізму, бо самой асновай нашай літаратуры з'яўляецца яе народнасць.

Зрэшты, любы добры мастацкі твор пачынаецца з любві. Усё нараджаецца з нейкай невымернай любві, бо той стан, які валодае пісьменнікам, калі ён піша твор, можна назваць своеасаблівым любоўным экстазам.

Мастацкі твор узнікае з таго, што пісьменнік мае выключнае замілаванне да роднага кута, роднай зямлі. Можна сказаць, кожны твор аўтабіяграфічны. Тое, што перажыта пісьменнікам, запала яму ў сэрца, хвалюе, радуе, клапоціць, абурае — усё гэта адбіваецца на характары твора. І калі ў пісьменніка пачуцці сапраўдныя, дык пішучы твор, ён абавязкова дасць гэта адчуць і перажыць чытачу. Любоў да таго, пра што пішаш — выключнае замілаванне, адданасць, захопленасць, — першая ўмова для ўзнікнення мастацкага твора. А інакш і чытач застанецца абыякавым, раўнадушным, калі не ўбачыць трапятання сэрца пісьменніка. Усе нашы лепшыя мастацкія творы менавіта з гэтага народжаны. Успомнім прысвячэнне, якое І. Мележ зрабіў, пачынаючы сваю «Палескую хроніку». Бачыце, пісьменнікам кіруе любоў да бацькоўскай зямлі, роднага краю і гэтая любоў вельмі шчырая, гарачая і яна запальвае сэрцы чытачоў.

Я сам напісаў сваю партызанскую трылогію таму, што быў удзельнікам і сведкаю падзей, якія ляглі ў яе аснову. Тыя падзеі запалі мне ў сэрца, у душу, і я проста не мог не расказаць пра іх, пра сваіх сяброў, таварышаў, а расказаўшы, нават адчуў палёгку і вызваліўся для іншых тэм, для тэм пра сённяшняе жыццё. Скажам, мая апошняя аповесць «Замяць жоўталісця», якая друкуецца ў «Полымі» прысвечана нашым дням. І, зноў жа, яна пачынаецца з любві. Я апісваю кут, дзе нарадзіўся, дзе сёння цячэ нафта, што выклікае пэўныя душэўныя перажыванні.

Любы пісьменнік, калі пачынае кнігу, прыкідвае і чалавека, шукаючы прататыпы, бачыць мясціны, якія сходжаны яго нагамі, калі піша пейзаж, дык ён піша пра тое, у што вельмі даўно закахаўся і таму пейзаж атрымліваецца пранікнёным...

Літаратура нараджаецца з любві! З любві да роднага кута, краю, да людзей, якіх ён ведае, сустракаў, бачыў, да маці, бацькі, братоў, сясцёр, дзеда, бабы і г. д. Адным словам, усё пачынаецца з любві!

Набыткі нашай літаратуры немалыя. Мне яны бачацца перш за ўсё ў тым, што сённяшняя беларуская літаратура адпавядае сучаснасці, запатрабаванням чалавека выхаванага, адукаванага. Але не ўзнятых літаратурай жыццёвых пластоў, праблем яшчэ многа. Новыя, маштабныя працэсы адбываюцца ў заводскіх, рабочых калектывах, у вёсцы, і наша літаратура павінна адлюстроўваць гэтыя перамены, дакладна, глыбока даследаваць духоўны, маральны клімат грамадства.

Зараз, напярэдадні XXV з'езда КПСС, калі партыя мабілізоўвае савецкі народ на здзяйсненне новых велічных задач камуністычнага будаўніцтва, нам, пісьменнікам, трэба падрахаваць, належным чынам ацаніць тое, што ў нас ёсць, чаго дасягнулі і на што ў першую чаргу звярнуць увагу, думаючы пра заўтрашні дзень літаратуры.

Мікола ЛОБАН

ПІСЬМЕННІК І КРЫТЫК

Хачу гаварыць аб супрацоўніцтве пісьменніка і крытыка — творцаў мастацкай і крытычнай думкі. Пытанне стаіць не пра арганізацыю такога супрацоўніцтва, а пра яго ўдасканаленне, зыходзячы з агульных імкненняў да далейшага ўздыму ідэйна-мастацкай вартасці нашай літаратуры і літаратурнай крытыкі. Не барацьба напрамкаў, груп і групачак, а супрацоўніцтва на прынцыповай грамадзянскай аснове, супрацоўніцтва, у якім на першы план ставіліся б не вузкаасабістыя, меркантыльныя ці якія падобныя меркаванні, а высакародная ідэя стварэння вялікіх мастацкіх каштоўнасцей.

Хачу дэталізаваць гэту думку.

Агульныя ўзаемаадносіны супрацоўніцтва заўсёды выяўляюцца ва ўзаемаадносінах канкрэтных. Гэта можа быць разавы выпадковы інтарэс крытыка да творчасці таго ці іншага пісьменніка, а можа быць і працяглы, калі крытык зноў і зноў, з паяўленнем кожнага новага твора, звяртаецца да творчасці таго ж пісьменніка. Гісторыя літаратур ведае мноства прыкладаў такога творчага супрацоўніцтва. Яно ўзнікае ў працэсе працяглага вывучэння, з'яўлення ідэйна-эстэтычнага аднадумства, глыбокага творчага давер'я, прыціркі густаў. Тайна падобных узаемаадносін, іх сіла ў тым, што яны свабодныя ад хоць якіх нацяжак, запабягання. Не сакрэт, што кожны пісьменнік, малы ён ці вялікі, напісаўшы новы твор, тайна гадуе надзею, што крытыка яго гэты твор знойдзе калі не геніяльным, то ва ўсякім разе таленавітым. Пісьменнік гатоў згадзіцца з любымі нацяжкамі, якія робяцца ў бок пераўвелічэння мастацкіх вартасцей твора. Ён нават не заўважае гэтых пераўвелічэнняў. А ўсё, што сказана пра заганы мастацкасці, што выклікае сумненні ў яго таленце, сустракае ў штыхі. Я вымаўляю гэта ўголас не для таго, каб пасмяяцца з сябе ці са свайго сабрата—тут няма нічога смешнага, такія пісьменніцкія пачуцці абсалютна нармальныя. Было б паталогіяй, калі б пісьменнік імкнуўся да процілеглага.

Але ёсць і яшчэ адзін сакрэт — жаданне ведаць праўду пра свой твор, дыстыляваную, не запарушаную ніякімі дамешкамі праўду. Пісьменніку, як паветра, патрэбна гэта праўда, без такой праўды немагчыма далейшае развіццё таленту, далейшая творчая работа. Але галізна праўды выклікае ў пісьменніка нейкае своеасаблівае пачуццё «сарамлівасці». Лепш за ўсё, калі б гэта праўда была сказана на вушка, шэптам, каб яе не чуў нават той, хто гаворыць. А калі ўсё-такі гэта немагчыма, калі праўду пра мастацкі твор павінен ведаць і чытач, то пісьменніку хочацца, каб гэта праўда была хоць вымаўлена тым чалавекам, які зробіць гэта з вялікай ашчадай яго пісьменніцкіх пачуццяў. Не думаю, што ёсць пісьменнікі свабодныя ад гэтай ранімасці, ад гэтай кволасці перад здаровым паветрам цвярозай крытыкі. Але ёсць пісьменнікі, якія ўмеюць пераадолець у сабе гэту казытлівасць пры сутыкненні з крытыкай.

Ці толькі ў дыстыляванай праўдзе ацэначнага характару патрэба пісьменніка ў крытыцы? Думаю—у большым. У жаданні, у абавязковасці праверкі сваіх думак, сваіх пачуццёвых рэакцый, сваёй пісьменніцкай логікі і аргументацый, у жаданні пазбавіцца суб'ектывізму і ў той жа час недзе ў нечым і дазволіць сабе астацца суб'ектыўным, захаваць сваё творчае «я». Здаецца, патрэбна нябачная, патэнцыяльная прысутнасць крытыка ў момант творчасці для ўмацавання аўтарскай самакрытычнасці.

А гэта ўжо прэтэнзія да нашай крытыкі з пазіцыі чытача. Наша крытыка, калі ўзяць яе ў агульнай масе, мала публіцыстычная. Можна назваць адно-два прозвішчы беларускіх крытыкаў, якім уласцівы ўзлёт сваёй уласнай думкі, нейкае імкненне выказацца. Я не кажу пра нейкія літаратурныя паралелі ці аналогіі са з'явамі саюзнай ці сусветнай літаратуры — пара нашу літаратуру разглядаць на гэтым узроўні, — я кажу пра выхад думкі крытыка за межы твора, творчасці, пра ператварэнне крытычнага твора ў самастойную літаратурную з'яву. Аналізуючы мастацкі твор, крытык раскрывае філасофскую, мысліцельную каштоўнасць твора і, уключыўшыся ў рэчышча аўтарскага мыслення, як бы паказвае, як можна было б прадоўжыць яго мысленне. Мне здаецца, гэта асаблівасць крытыкі, яе моцны публіцыстычны настой — хочацца тут прыгадаць імя Алеся Адамовіча — сведчанне высокага ўзлёту грамадскага мыслення.

волну альпийского орогенеза», «В ордовике-силуре, карбоне-перми, юре-мелу преобладают гребни волн, а к началу девона, триасу, концу мела и отчасти к концу неогена приурочены впадины» (стар. 58).

Р. Баландзін без ўсякага сумнення пераносіць з'явы мікрасвету ў макрасвет, з жывой прыроды ў нежывую і назад. Але падыход да жывога з такіх пазіцый — недыялектычны, таму што «для дыялектычнага матэрыялізму пазнанне жыцця заключаецца ва ўстанаўленні яе якаснага адрозненя ад іншых форм матэрыі» (БМЭ, т. 10, стар. 413).

Аўтар, захапляючыся, няправільна трактуе некаторыя біялагічныя дадзеныя, напрыклад, дадзеныя эмбрыягенеза нервовай сістэмы (стар 152). «Яна (нервовая сістэма),—піша ён,— пачынае разгаліноўвацца ў чалавечым зародышу знутры, ад ствала хорды». Між тым, яна разгаліноўваецца не «ад ствала хорды», а ад «первовай трубкі». Хорда тут ні прычым.

І гэта апраўдваецца тым, што «навукова-папулярная літаратура—дзейсны сродак міжнавуковага абмену і філасофскага асэнсавання дасягненняў самых розных навук», таму, маўляў, яна прызначаецца для ўзбуджэння «творчай актыўнасці, фантазіі чытача, нават чытача з ліку прафесіянальных вучоных» («Пасляслоўе», стар. 222). «А для дапытлівага неспецыяліста такога роду падарожжа (у незнаёмае—**Г. Ш.**)... цікава і карысна» (стар. 225).

Наўрад, ці такая папулярызацыя навукі прынясе каму-небудзь карысць. «З навукай трэба абыходзіцца па-навуковаму!» — сказаў адзін вучоны і дастаткова звярнуцца да спадчыны заснавальнікаў гэтага жанру літаратуры. Каго б з іх мы ні ўзялі, вучонага або пісьменніка — Фарадзея або Герцэна, Бекетава або Пісарава, Ціміразева або Л. Талстога, Ферсмана або Горкага,—усе яны далёка не апошняй якасцю папулярнай кнігі пра навуку лічылі праўдзівасць і пераканальнасць выкладання матэрыялу.

Г. ШЭРШАНЬ,
рэдактар выдавецтва «Беларусь».

Аўтар прадмовы—Пятрусь Броўка

«Добрый след» — кніга нарысаў пра нашых сучаснікаў, пра тых, хто сваёй нястомнай, натхнёнай працай дабіўся ў апошнія гады крутога ўздыму сельскай гаспадаркі. Аўтар гэтага зборніка, што выйшаў у Маскве ў выдавецтве палітычнай літаратуры, — спецыяльны карэспандэнт газеты «Сельская жизнь», лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР за 1974 год Ганна Харытонава, а прадмову «Присягнувшие на верность земле» напісаў народны паэт Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі Пятрусь Броўка.

«Аўтара гэтага зборніка, — зазначае ён, — я ведаю даўно. Я помню яе выхаванкай дзіцячага дома, затым — юнай работніцай Мінскай швейнай фабрыкі імя Крупскай, студэнткай Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Ламаносава, а апошнія дваццаць гадоў ведаю як добрага, на дзіва працаздольнага журналіста».

Сярод герояў нарысаў журналісткі — людзі самых розных узростаў і прафесій з усёй нашай неабсяжнай краіны. Цёпла, пранікнёна піша Г. Харытонава і пра беларусаў — брыгадзіра агароднінаводчай брыгады Раісу Сямёнаўну Самцову, меліяратара з Палесся Івана Андрэевіча Паліўку, бібліятэкарку Галю Чорную...

«Усе без выключэння героі Г. Харытонавай, — заўважае П. Броўка,—людзі працы, якія цвёрдым почыркам пішуць сваю біяграфію. Яны ўпэўнена перадаюць сваю справу ў маладыя, надзейныя рукі, пакідаючы на зямлі глыбокі, прыкметны след. Добры след».

С. ВІРЗОЎСКІ.

НАШЫ ДЗЕЦІ—НАШ ЛЁС

У Навукова-даследчым інстытуце педагогікі Міністэрства асветы БССР адбылася дыскусія на тэму «Дзеці і мы», якая была арганізавана інстытутам педагогікі, камісіяй па нарысу і публіцыстыцы і бюро секцыі дзіцячай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР. У аснову дыскусіі пакладзены артыкулы пісьменніка Васіля Віткі, апублікаваныя летась у часопісах «Маладосць» («Чалавек, натоўп, мода») і «Полымя» («Дзеці і мы»).

Дырэктар інстытута, правадзейны член Акадэміі педагагічных навук СССР, доктар філалагічных навук В. Івашын ва ўступным слове адзначыў, што праблемы, узнятыя пісьменнікам, хвалююць шырокую грамадскасць.

У дыскусіі выступілі У. Юрэвіч, А. Клышка, Г. Шупенька, В. Якавенка, Р. Аляхновіч, П. Лятэцкая, В. Протчанка і іншыя.

XXV Дэлегаты з'езда

Семнаццаць гадоў кіруе саўгасам «Баноль» Полацкага раёна Аляксандр Емяльянавіч Рудаў. За гэты час гаспадарка дабілася вялікіх поспехаў у развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці.

Праца ўмелага арганізатара, вопытнага спецыяліста адзначана двума ардэнамі Леніна. А. Рудаў — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. А на абласной партыйнай канферэнцыі ён выбран дэлегатам на XXV з'езд КПСС.

Адным з лепшых машыністаў Аршанскага лакаматыўнага дэпо імя К. Заслонава па праву лічыцца камуніст Аляксандр Іванавіч Шутко. Многа гадоў водзіць ён паязды па стальных магістралях.

Камуністы Віцебшчыны выбралі перадавога машыніста А. Шутко дэлегатам на XXV з'езд КПСС.

Фота А. ЦЕРЛЮКЕВІЧА (БЕЛТА).

У ВЯНОК ДРУЖБЫ

Араміс СААКЯН

Арменія

НА ПРАВАХ РАШАЮЧАГА ГОЛАСУ

Трыбуна з'езда.
Велічна і казачна
Гараць агні,
У чырвані — сцягі.
З яе вяршыні сёння
Будзе сказана
Нямала думак,
Сэрцу дарагіх,
Пра сілу й веліч подзвігу
народнага,
Калі Кастрычнік крылы развінаў,
Калі ў дні асеннія халодныя
Прыйшла ў краіну вечная вясна.
Калі народ,
Што змрок жуды рассеяў,
З народаў іншых
Рабскі скінуў гнёт,
Калі той слаўнай восені
Падзеі
Гісторыі усёй
Змянілі ход.
Яшчэ размова пойдзе там, таварышы,
Пра лёс наш,
Поўны шчасця і святла,
Пра будучынь,
Пра справы нашы важныя,
Пра славу,
Што над светам узышла.
Пра дружбу,
Што праверана экзаменам
Змагання й працы, светлых нашых дзей.
Пра партыю,
Што сцяганосна, зарыўна
І маякова свеціць для людзей.
І пра сяброў — людзей сардэчных
самых,
Што дораць нам абдымкі і цяпло,
Пра ворагаў, якія ёсць таксама
У тых, хто на планеце нішчыць зло,
І пра маё, вядома ж, пакаленне,
Што аб'яднала ў маналітны сплаў
Суровы роздум
З маладым здзіўленнем,
Душы гарэнне
З велічнасцю спраў.
Прастор Зямлі —
Ад полюса да полюса —
Як быццам бы разбуджаны вясной,
І на правах рашаючага голасу
З'езд праўду нашу
Скажа свету зноў!

Пераклаў К. КАМЕНІНА.

Міхайла СІРЭНКА

Украіна

●

Зямля і Ленін... Ленін і Зямля,
Зямля-планета і зямля калгаса.
І хвалямі з-пад лемяшоў рапля
Плыве пад небасхіл вясенні, ясны.

Пасеем зерне — руні дружнай зелень
Палі ўпрыгожыць без канца і краю.
Я хлебароб...
Таму для мяне Ленін —
Мая зямля з багатым ураджаем.

Карло КАЛАДЗЕ

Грузія

●

Сад падрастае. Ён яшчэ дзіцё,
зялёны хлопчык, крыху сарамлівы.
Іду між дрэў. Мой смешны цень,
сагнуўшыся, спяшаецца за мною...
Вось дрэўца,
нібы даўгавязы хлопец,
якому так перашкаджаюць
локці,—
такіх тут большасць.
Ды затое іншых,—
вялікіх і зялёнашумных
равеснікаў маіх
пералічыць магу па пальцах...
Я з сівізной сваёй
сыходжу саду гэтаму ў бацькі,
і ўсё-ткі сад — мая вясна!
І я ўдзячны дрэўцам маладым
за шум галінак, сонца і расу,
за водгулле у сэрцы, глыбіню дыхання.
Вясна ў маёй душы!
Зірніце — дуб стары,
старэйшына і патрыярх ўсіх
дрэў
зазеляненў так шчодра,
захапіўшыся падросткам-садам,
бо з ім ён — заадно.
Зірніце і запомніце!
Магчыма, лістапад
дыхне вам у душу —
дык захініце маладых
ад восені.
І дум сваіх асенніх
насільна не навязвайце вы ім...
Сад падрастае.
І яму патрэбны
давер і дабрата,
вада і сонца,
каб ён акрэп і узмужнеў...
Давайце верыць
ў будучыню сада!

Пераклаў В. ШЫМУК.

Сапармурад АВЕЗБЯРДЫЕЎ

Туркменія

ТЫ КВІТНЕЕШ, МОЙ КРАЙ

Ты, натхненне, збірайся ў дарогу
хутчэй!
Глянь, сады зацвітаюць
І песні плывуць над садамі.
Незабыўны мой край,
Адгукніся ты ў сэрцы гучней,
Каб мой голас
З другімі гучаў галасамі.

За пачуцці і шчырасць
Туркменскія песні люблю.
Калі іх заспяваю,
Заўсёды душой маладзею.
О краіна мая,
Твой узвышаны голас лаўлю.
Ты і шчасце маё
І вялікая наша ідэя!

Зыркім сонцам заліты,
Задаволены доляй сваёй,
Ты квітнееш, мой край,
Як сады светлай раніцай весняй.
Я не той,
Хто любуецца толькі тваёю красой, —
Я складаю табе
Найзванчэйшую песню.

Ты, натхненне маё,
Чуеш сэрца ўсхвалёваны кліч!
І над кожным радком
Раскрывай свае крылы імгненна.
У пачуццях і думках
Паўстае прада мною Ільіч,
А ты чуеш, натхненне!
Са мною гаворыць сам Ленін!

Як духмяняць сады!
Як піруюць яны у красе!
Сівізной у мяне
Не аснежаны скроні...
О Туркменія мілая,
Знаю, наперадзе ўсе
Яшчэ лепшыя песні,
Што выспеліць час наш натхнёны.

Пераклаў Ю. СВІРКА.

СЯРОД КНІГ

АДНА ПРЫВІЛЕЯ НА ЗЯМЛІ

КНІГА Леаніда Сузіна «Калі запальваюцца зоркі» пра Героя Сацыялістычнай Працы, былога дырэктара Аршанскага льнокамбіната Георгія Васільевіча Сямёнава — не першая сярод дакументальных аповесцей і мастацкіх нарысаў, што выходзяць у выдавецтве «Беларусь» у серыі «Людзі працоўнага і ратнага подзвігу». Разлічаны яны на шырокага чытача і расказваюць пра справы тых, хто ідзе ў авангардзе будаўнікоў камуністычнага грамадства.

Аўтары гэтых кніг паказваюць не толькі жыццё канкрэтных людзей, але і спрабуюць даць адказ на такія важныя пытанні, як узаемаадносіны асобы і калектыву, спалучэнне асабістага і грамадскага, роля кіраўніка і адносіны яго з падначаленымі, творчая атмасфера і сацыялістычнае спаборніцтва.

Падобныя задачы, безумоўна, стаялі і перад Л. Сузіным. Тым больш, што герой яго пражыў яркае і цікавае жыццё. Камуніст з дваццаць чацвёртага года, ён рос і мужнеў разам з краінай. Шлях, што прайшоў Г. Сямёнаў «ад падсобніка, хлопчыка на пабягушках да дырэктара буйнога прадпрыемства, дзяржаўнага дзеяча», характэрны. Правільна заўважае аўтар: «У гэтым звычайным, заканамерным для нашага сацыялістычнага ладу жыцця можна ўбачыць і шмат павучальнага, цікавага для тых, хто пачынае самастойны шлях, шукае сваю дарогу, сваё прызванне».

Жыццёвых фактаў, як кажуць, больш чым патрэбна. І нарысісту важна не згубіцца сярод іх, за ўсімі гэтымі лічбамі і вытворчымі паказчыкамі ўбачыць самога чалавека.

Думаецца, Л. Сузін знайшоў правільнае вырашэнне тэмы. Ён пабудаваў нарыс з васьмі асобных раздзелаў, кожны з іх расказвае аб пэўным перыядзе ў жыцці героя. Перад намі паўстае не адміністрацыйная асоба, для якой важныя толькі эканамічныя паказчыкі, а жывы чалавек, што разумее сваю адказнасць перад партыяй і народам і ўмее знайсці кантакт з людзьмі. Разам з тым, ён вопытны спецыяліст, арганізатар. Што ж гэта — своеасаблівасць характару, нейкая выключнасць? Не, такая наша сацыялістычная ява, калі кожны чалавек мае магчымасць ярка раскрыць свае творчыя задаткі, стаць чалавекам дзяржаўнага маштабу.

Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла перад Г. Сямёнавым, як і перад сотнямі, тысячамі людзей, светлыя пуцявіны. У аўтабіяграфіі ён пісаў: «Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя дала мне ўсё: працуй і вучыся, згадвай самыя светлыя мары і здзяйсняй іх. І было адно вялікае патаемнае жаданне, яно заўсёды напамінала аб сабе і непакоіла: толькі б жыць так, каб гэта было дастойна высокіх ідэалаў рэвалюцыі, жыць у турботах і барацьбе, змагацца і перамагаць».

Ён становіцца ўрады актыўных яе барацьбітоў. Ужо ў дваццатыя гады фарміруюцца такія якасці Г. Сямёнава, як партыйная прынцыповасць, ідэйная перакананасць, маральная чысціня і непрымірымасць да ворагаў рэвалюцыі.

У 1927 годзе Георгій Васільевіч — старшыня праўлення кааператыўнай ткацкай фабрыкі, пазней вучыцца ў Маскве ў Прамысловай акадэміі. Пасля заканчэння яе і прыехаў у Оршу. Аршанскі льнокамбінат яму давялося будаваць двойчы. Перад вайной і пасля выгнання акупантаў з беларускай зямлі. Гэтаму перыяду ў жыцці Г. Сямёнава прысвечана большая частка нарыса. Тут Л. Сузін дасягае найбольшага поспеху. Ён паказвае свайго героя ў самых складаных жыццёвых сітуацыях, раскрывае яго дзейнасць як кіраўніка шматтысячнага калектыву, гаворыць аб надзвычайнай уважлівасці і чуласці да людзей. Камуніст Сямёнаў у нарысе неаддзельны ад Сямёнава-чалавека.

Памер твора ў пэўнай ступені абмяжоўваў магчымасці аўтара, скоўваў яго. Таму месцамі падзеі толькі называюцца і не атрымліваюць належнага мастацка-публіцыстычнага раскрыцця. З'яўляецца эскізнасць, пэўная штрыховасць. Л. Сузін хацеў сказаць пабольш, пра галоўнае, выявіць індывідуальнае ў характары героя. Асабліва гэта відаць у тых эпізодах, дзе Г. Сямёнаў паказаны сярод рабочых завода.

...У камуніста ёсць адна прывілея — быць чалавекам на зямлі. Ёй і валодае Георгій Васільевіч Сямёнаў, адзін са шматмільённай арміі камуністаў-ленінцаў.

Мікола ДУБОЎСКІ.

Л. Сузін. Калі запальваюцца зоркі. Серыя «Людзі працоўнага і ратнага подзвігу». Мінск, «Беларусь». 1973.

Дэлегаты XXV з'езда КПСС

Рабочы Гродзенскага мясакамбіната, Герой Сацыялістычнай Працы Генадзь Георгіевіч Калабун.

Дырэктар сярэдняй школы № 4 г. Слоніма Міхаіл Георгіевіч Трафімовіч.

Слесар-зборшчык Гомельскага завода вымяральных прыбораў, Герой Сацыялістычнай Працы Пётр Трафімавіч Дземчанка. Малюнкі І. МІСКО.

ЧУЖОГА БОЛЮ НЕ БЫВАЕ

П'ЕСА «ІНТЭРВ'Ю У БУЭНАС-АЙРЭСЕ» Г. БАРАВІКА У МАГІЛЕЎСКІМ АБЛАСНЫМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ

АКТЫЎНАЕ выкрыццё фашызму, дзе б і ў якіх бы формах ён ні нараджаўся, — ганаровы абавязак нашага мастацтва. І вось у ліку спектакляў, што тэатры рэспублікі прысвяцілі XXV з'езду КПСС, — гэты. П'еса належыць пяру вядомага журналіста - міжнародніка. Яна напісана па гарачых слядах падзей.

...У глыбіні сцэны нізкая металічная агароджа накшталт тых, што ў нашых гарадах аддзяляюць праезджую частку ад тратуара. Прыхіліўшыся да яе, прысеўшы, адкінуўшыся на перакладзіну глядзяць прама ў залу хлопцы. Разглядаюць гледачоў, перакідваючыся нячутнымі рэплікамі. Хлопцы як хлопцы. Звычайныя з выгляду. Але штосьці ваяўнічае, нядобрае ўжо адчуваецца ў іх бесцырымонным разглядванні. Удар гонга. Хлопцы ўстаюць, здымаюць са штыроў светлавыя пісталеты і імгненна нацэльваюцца імі ў залу. Кулямётныя чэргі, перахліставанне светлавых праменняў.

Так пачынаецца гэты спектакль у Магілёве. З высокай ноты, адразу ж набірае імклівы рытм, гукі напаўняюць залу, а крыху нервовае акцёрскае выкананне імгненна перадаецца гледачам.

Дзея п'есы адбываецца ў сённяшнім Чылі, але атмасфера спектакля адразу ж нагадвае нам пра мноства краін, дзе ўзнікаў фашызм. Адразу ж пазнаецца твар «звычайнага фашызму», праўда, гісторыя Карласа Бланка, яго сяброў і ворагаў — гэта гісторыя чылійская, сучасная, быццам бы ўзятая драматургам Генрыхам Баравіком са старонак свежых газет.

Журналіст і пісьменнік Баравік як бы прымае эстафету ў Міхаіла Кальцова, Канстанціна Сіманава, Рамана Кармена. Жывое, дакументальнае пераплаўляецца ў мастацкія вобразы. Пісьменнік ідзе па гарачых слядах падзей і цяжка (ды і наўрад ці патрэбна) адарвацца ад пазнаваемых, яшчэ рэальных людзей, якія змагаюцца па розныя бакі барыкад.

У спектаклі Магілёўскага абласнога тэатра ў Карласа Бланка, Эрнеста Рохаса, генерала Пабло Хіменеса, Габрыэля Фастоса ёсць прататыпы — сябры і ворагі чылійскай рэвалюцыі, якія яшчэ жывуць, яшчэ змагаюцца. Змененыя імёны нічога не значаць. У спектаклі пульсуе кроў, якая льецца ў Чылі. І тое, што сёння хвалюе кожнага чалавека на зямлі, прыцягвае да спектакля напружаную цікавасць.

Два ўсцеленыя газетамі планшэты кампазіцыйна аб'ядноўваюць аголеную тэатральную сцэну—далёкі, адыходзячы ўгору заднік і падлогу. Калі фашысты пачнуць паліць кнігі, вецер пагоніць па сцэне, збіраючы ў кучу, цяпер ужо нікому непатрэбныя газетныя старонкі. Мы бачылі гэта ў кадрах кінахронікі — мяцеліца з друкаваных лістоў. Газеты, кнігі, партрэты. Усё, што служыла старой уладзе і перашкаджае новай. З паперай расправіцца няцяжка. Але газеты прачытаны. Заклікі і каментарыі засталіся ў памяці. Захоўваюцца ў памяці і імёны журналістаў, якія аддалі сваё пяро служэнню ісціне. Цяжкім шляхам прыходзіць да яе Карлас Бланка. Аб ісціне расказаў ён у сваім апошнім інтэрв'ю, напісаным пасля страты блізкіх і радзімы, у эміграцыі, у Буэнас-Айрэсе. Адсюль і назва п'есы. У спектаклі гэта апошні маналог Бланка.

Апусцела сцэна, заціхлі музыка, крыкі. Праз доўгую плоскасць сцэны ідзе прама да гледачоў Бланка і гаворыць аб тым, што падводзіць вынік яго цяжкога жыцця. Нялёгкая задача ў акцёра К. Масквіна — у своеасаблівае эпазінаборства са шматаблічнымі, шматтэмнымі роздумамі спектакля ўцягвае яго рэжысёр. З усяго ўбачанага, расказанага, пачутага трэба зараз высечы іскру гневу. З гэтай іскрай, з гэтым неспакоем у сэрцы павінен пакінуць тэатр глядач.

Багацейшая рэжысёрская фантазія, якая стварае з намёкаў вобразы, сімвалы, алегорыі, і поўная акцёрская свабода — вось дзве сілы спектакля, што нараджаюць яго гармонію. Не стрымліваючы, не ламаючы, не падпарадкоўваючы сабе акцёрскую прыроду, а, наадварот, верачы ў яе, вызваляючы і крышачку падштурхоўваючы да самавылўлення, будуе ўвесь спектакль рэжысёр-пастаноўшчык Ю. Міроненка.

Карлас Бланка вядомы ў краіне. З ім лічацца. Яго артыкулаў чакаюць. Але па яго артыкулах і судзяць, і садзяць у турму, расстрэльваюць. Не, ён да гэтага, здаецца, не заклікаў. Ён не хацеў чыёйсьці канкрэтнай смерці. Ён нават гатовы заступіцца, прасіць аб памілаванні, як, напрыклад, у гісторыі з дачкой клоуна Бома. Прамая віна і ўскосная віна, учынак і маўклівае патуранне несправядлівасці—усё гэта ў цэнтры разгляду п'есы і спектакля.

Напэўна, пра гэта можна было б расказваць сродкамі псіхалагічнай драмы, ператварыць у камедыю, аддаць сатырычнаму асмяянню. У любым выпадку трагічнае прасвятленне аднаго чалавека не стала б болем усіх. Рэжысёр шматразова тыражуе гісторыю памылак Карласа Бланка, надаючы ёй вострую палітычную афарбоўку. І ўжо не сюжэтная інтрыга, а палітычныя дзеянні, роздумы тэатра, ход думак герояў прыцягваюць увагу гледачоў. Лёс сацыяльнай рэвалюцыі становіцца не фонам, а дзейнай асобай спектакля.

Другая дзея. Тыя ж напаўголыя юнакі бяруць урокі бокса. Замест гумавай групы для трэнажу служаць ватныя чалавечыя фігуры. Забава, але і падрыхтоўка. Зноў нітосьці злавеснае праступае ў гэтых на першы погляд нявінных спартыўных занятках. Секунда і ватныя фігуры павешаны на каласнікі. Цяпер гэта трупы павешаных, а малойчыкі пайшлі ўжо сценка на сценку. Праз мінуту пераможцы выедуць на сцэну на танку. Так, на танку з кучай істэрычных дзевак і маўкліва насцярожаных юнакоў з'явіцца ў доме Бланка ягоны сын Хасе. Пра яго вядома, што ён не завадатар, не лідэр, не забойца. Хасе адзін з тых падуладных стыхіі маладых людзей, на якіх апіраюцца лідэры. Карыстаючыся старымі тэрмінамі, яго можна ахрысціць «гарматным мясам».

Рэжысёр Ю. Міроненка і выканаўца ролі Хасе С. Хітрык не спакушаюцца сюжэтнай магчымасцю ўзбуйніць гэтага героя. Чаму добрыя, слаўныя, на першы погляд, хлопцы становяцца апорай фашыстаў? Вывад тэатра такі — прычына ў безадказнасці, міякцеласці. Хасе непераборлівы, ён аднолькава лёгка паддаецца на ўгаворы бацькі, сястры, мачахі, любоўніцы, былога крамніка Фастаса. Ён прывык жыць чужым розумам, падпарадкоўвацца чужой волі. Задурманеную алкаголем свядомасць такіх вось Хасе лёгка заваёўваюць «былыя крамнікі».

Габрыэль Фастас у Ю. Чупрынава ціхі фашыст, спакойны, разважлівы. Зноў-такі, ідучы за драматургічным матэрыялам, лёгка было ўбачыць гэтакую разнавіднасць Адольфа Гітлера. Але карыкатура парушыла б тон і жанр спектакля.

Працуючы над п'есай, напісанай аб эскалацыі фашызму, тэатр упарта абыходзіць знаёмыя вобразы - стэрэатыпы, лёгкія асацыяцыі. У найскладанейшых інтэрмедыях спектакля паслядоўна, з усё ўзрастаючым напорам вышукваюцца карэнні сённяшняга фашызму. Ён мяняе сваё аблічча, свае лозунгі. Яго не адразу ўдаецца разгледзець пад лахманамі хіпі або рэспектабельным фракам. Але сутнасць яго трэба паказаць усім. І тут тэатр не скупіцца на эпітэты, на фарбы, на тэмперамент.

У спектаклі занята амаль уся трупа тэатра, ва ўсякім разе ўся моладзь на сцэне. У Юрыя Міроненкі даўняя цяга да шматнаселеных спектакляў. У гэтым ужо з першых крокаў асабліва крэда мастака. Найскладанейшыя масоўкі ў яго не фон для галоўных герояў, яны самі па сабе дзея, актыўныя сілы, якія ўрываюцца ў вузкасямейныя канфлікты.

Па тэхнічных і пастановачных складанасцях спектакль «Інтэрв'ю ў Буэнас-Айрэсе», як хтосьці дасціпна заўважыў, зрабіў рэвалюцыю на магілёўскай сцэне. Гутарка ідзе не столькі аб наватарстве рэжысёрскіх прыёмаў, колькі аб смелым наступленні на прав'нцыялізм. Рэжысура дае прынцыповы бой скептычным поглядам на магчымасці абласнога тэатра.

Неяк ужо так само сабой павялося, што маштабныя, складаныя ў пастановачным вырашэнні спектаклі па сілах толькі сталіцы. Абласным жа тэатрам зручна мець рухомы, маланаселены спектакль, які лёгка загружаецца ў тэатральны аўтобус і можа ў любы дзень іграцца на любой сцэне. Вядома, «Інтэрв'ю ў Буэнас-Айрэсе» не сыграеш на клубнай сцэне, але спектакль такі павінен быць у абласным горадзе — апрача ж вялікага палітычнага, выхаваўчага значэння, ён яшчэ і сведчыць аб узроўні сучаснага сцэнічнага мастацтва.

Гэты высокі сучасны ўзровень павінны дэманстраваць сённяшняму тэатральнаму гледачу не столькі гастралёры, колькі свае калектывы. Мне думаецца, што ў святле надзённай усеагульнай барацьбы за якасць новая работа Магілёўскага абласнога тэатра павінна быць расцэнена як выдатны падарунак да з'езда партыі.

У фінале спектакля ля металічнай агароджы ў глыбіні сцэны зноў стаяць хлопцы. Гэта другое пакаленне. Гэта другія хлопцы. Яны майструюць з газеты і запускаюць у неба папяровых жураўлікаў. А ў небе нарастае гул рэактыўных самалётаў. Магчыма, дзесьці зноў паўторыцца чылійская трагедыя? Што будзе з гэтымі хлопцамі? Глядач выносіць са спектакля неспакой за іх лёс.

Таццяна АРЛОВА,
кандыдат мастацтвазнаўства.

XXV Дэлегаты з'езда

ГОДНАСЦЬ АРТЫСТА — ГОДНАСЦЬ ГРАМАДЗЯНІНА

Гартаем старонкі летапісу коласаўцаў часоў вайны. Акцёр працуе ў асяроддзі майстроў першай велічыні — ён партнёр П. Малчанава, Ц. Сяргейчыка, А. Радзялоўскай, М. Бялінскай, А. Шэлега... Штосьці з «урокаў Мяркур'ева» замацоўваецца, нейкія моманты даводзіцца пераглядаць, ад нечага і адмаўляцца. Тут, у Другім БДТ, назапашаны свой вопыт, тут сабраліся ў адзіны калектыў адметныя артыстычныя індывідуальнасці, і гэта пераходзіла ў якасць, у самабытнасць творчай дзейнасці, у клімат творчага жыцця. Калі гаворыш пра гэта з артыстамі, яны справядліва заўважаюць, што цяпер адметнасць таго або іншага акцёрскага ансамбля праяўляецца

АДЧУВАННЕ годнасці савецкага артыста Фёдар Шмакаў праносіць праз усё сваё тэатральнае жыццё. У яго выдатная акцёрская школа — ён вучань адмысловага майстра сцэны і чулага педагога Васілія Мяркур'ева. Помню, што і на пачатку дзейнасці, напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, ён звяртаў на сябе ўвагу працавітасцю. У трупу тагачаснага Рускага тэатра БССР улілася вялікая група выхаванцаў Ленінградскага інстытута тэатральнага мастацтва, сярод якіх быў і Ф. Шмакаў. Толькі яны пачалі праходзіць, як кажуць, практычныя «азы» акцёрскай работы, як успыхнула вайна. Лёс накіраваў Ф. Шмакава ў Другі БДТ (цяпер — Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Якуба Коласа). Пачаў ён

там, здаецца, з выхаду ў масоўцы ў спектаклі «Несцерка».

Ёсць у гэтым факце штосьці сімвалічнае. У цяжкія для краіны дні малады артыст іграе эпізадычную ролю ў жыццярадаснай і дасціпнай камедыі, паглыбляецца ў стыхію народнага гумару, нібы беручы старт для вялікага жыцця ў мастацтве. Заўважым, што цяпер Ф. Шмакаў радуе гледачоў у галоўнай ролі ў гэтым вясёлым відовішчы на сцэне — ён змяніў выдатнага беларускага артыста Аляксандра Ільінскага і выступае хітравата мудрым, гарэзлівым і відушчым Несцеркам у коласаўцаў. Мабыць, няма патрэбы гаварыць, які гэта павучальны для мастака шлях — ад ролі амаль «без тэксту» да галоўнай! Больш таго — да ролі, якая мела непаўторнага інтэрпрэтатара, выдатнага першага выканаўцу.

Таму варта падкрэсліць, што, гаворачы пра годнасць артыста, трэба мець на ўвазе і яго здольнасць вучыцца, яго ўменне і ў «майстрах» заставацца «вучнем». Такі — Фёдар Шмакаў.

хутчэй за ўсё ў нюансах і адценнях, бо «рэпрэзантыўнасць» узяла на сябе цалкам рэжысёра. Гэта ад рэжысёры залежыць, што прапануецца першнаперш гледачу: ці псіхалагічная праўда паводзін кожнага персанажа ў пэўнай ідэйнай канцэпцыі спектакля, ці пастановачныя эфекты і арыгінальная трактоўка п'есы бярэ верх над усімі астатнімі кампанентамі.

Дык вось Ф. Шмакаў любіць працаваць з рэжысёрамі, для якіх воля драматурга, яго задума і яго стыль — гэта нешта свяшчэннае. Яму хочацца іграць, напрыклад, Астроўскага або Горкага, а не тое, што думае пра Астроўскага або Горкага сённяшні рэжысёр. Колькі разоў я глядзеў «Гамлета» ў коласаўцаў, і заўсёды сярод галоўных персанажаў трагедыі адчуваў прысутнасць і пільны позірк разумных вачэй Гарацыо. Шмакаўскі студэнт, адукаваны і дасведчаны сын свайго часу, гэты чалавек з нейкай дзівоснай сумнай усмешкай на вуснах быў надзвычай патрэбны Гамлету — Малчанаву. Бо куды ж яшчэ адрасаваць самыя разумныя філасофскія высновы і эмацыянальны боль Гамлету, як не Гарацыю! Так напісаў Шэкспір.

Сінцоў у «Ворагах» М. Горкага і Платон Зыбкін у камедыі «Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага, Пеця Прысыпкін ў «Клапе» У. Маякоўскага і Аксён Каль у сцэнічным пераказе трылогіі Я. Коласа «На ростанях» (п'еса «Навальніца будзе» А. Звонака), Акім у спектаклі «Улада цемры» па п'есе Л. Талстога і старшына Васкоў у інсцэніроўцы «А зоры тут ціхія...» паводле аповесці Б. Васільева... Нават такі пералік амаль што палярных па характарах і па светапоглядах герояў Ф. Шмакава на коласаўскай сцэне сведчыць пра шырыню яго мастакоўскіх інтарэсаў. А разумны і трывожна настроены Уладзімір Каравай з макаёнкаўскай «Таблеткі пад язык»! Як пранікнёна і шчыра дзяліўся гэты персанаж з усімі намі сваім роздумам пра хараство адданасці чалавека зямлі, колькі цеплыні перакідвалася праз рампу, калі ён пакутаваў і разумеў прычыны таго «выраю», у які адлятаюць маладыя аднавяскоўцы Каравая, яго надзея і яго любоў... Жывы чалавек у святле рампы, партрэт аднаго з тых, каго мы сустракаем сёння ў натоўпе на сталічнай плошчы і ў цішыні праўлення калгаса, — такі шмакаўскі Уладзімір Каравай. З тых, каго я асабіста бачыў на сцэне ў ролі Каравая, ён — самы пераканаўчы, самы «падобны» да жыццёвага прататыпу.

У абліччы Шмакава-артыста ёсць яшчэ адна рыса, блізкая ад яго ўмення вучыцца заўсёды і ўсюды. Ён — назіральны мастак. Не толькі ў паўсядзённым жыцці (мне даводзілася прысутнічаць пры яго гутарках з сельскімі механізатарамі — і як ён ведае патрэбы і інтарэсы «чалавека за баранкай»!). Ён уважліва сочыць за больш спрактыкаваным партнёрам на сцэне. Ці не таму, напрыклад, мы параўноўвалі некалі яго выкананне ролі Артура Рыварэса («Авадзень» паводле кнігі Э. Войніч) з выкананнем гераічных роляў П. Малчанавым, а ў тым жа Несцерку шукаем і радуемся творчым пераасэнсаванням знаёмых інтанацый А. Ільінскага. Вучыцца ніколі не грэх, і ён, народны артыст СССР, вядучы майстра коласаўскай трупы, амаль на кожнай рэпетыцыі дэманструе патрабавальнасць да сябе. Ён прыходзіць у тэатр падрыхтаваным да сапраўднага творчага пошуку, калі акцёр смела перакрэсліваe знойдзенае ўчора і паглыбляецца сёння ў зусім новы варыянт сцэнічнага жыцця героя. Няўрымслівы? Так. Фёдар Шмакаў — акцёр, які не спадзяецца на тое, што вопыт яго «вывезе». Ён — мастак. Яму дарагое самастойнае слова ў тэатральнай трактоўцы нават самага вядомага драматургічнага твора.

Бывае, мы сочым за Ф. Шмакавым у ролі тады, калі яго персанажу нібы і няма чаго рабіць на сцэне, бо эпізод цяпер ідзе ад іншых герояў. І тэксту ў яго няма. Гэта здараецца ў «Зорах...», ва «Уладзе цемры» і ў «Снежных зімах». Думаю, Ф. Шмакаў выдатна засвоіў адну параду К. Станіслаўскага. Вось якую: не чакаць, што аўтар п'есы дасць у распараджэнне акцёра тэкставыя дэталі, каб характар героя раскрываўся паўней у кожны момант спектакля. «Калі аўтар дае намёк на характар у самым пачатку ролі, то ён упэўнены, што праз гэта як бы праз павелічальнае шкло акцёр, а за ім і глядач убачаць усю ролю і ўсе звязаныя з ёй эпізоды», — заўважыў аднойчы Станіслаўскі. Уменне развіваць мімічнай ігрой, жэстыкуляцыяй, рухам па сцэне, эмацыянальна насычанымі паўзамі тое, аб чым «заяўлена» драматургам хоць бы і ў адной толькі рэпліцы, — шчаслівы талент мастака. Ды і такі талент трэба шліфаваць. Як гэта і робіць на працягу ўсяго свайго жыцця ў тэатры Ф. Шмакаў. Таму амаль кожны персанаж у яго рэпертуары — гэта партрэт пэўнай чалавечай асобы, памастацку асэнсаванай і зробленай больш зразумелай для тых, хто ў зале, для шырокай аўдыторыі.

Нядаўна рэжысёр аб'яднання «Летапіс» студыі «Беларусьфільм» Р. Дзодзіева здымала дакументальную стужку пра цяперашні тэатр коласаўцаў. І яна заўважыла, што нават тады, калі кінакамера не «глядзіць»» на Ф. Шмакава, ён паводзіць сябе на здымачнай пляцоўцы так, нібы яго трымаюць на «прыцэле». Адкуль такое арганічнае адчуванне камеры? Зноў жа — гэта рыса сапраўднага артыста. Ён не «фіглярнічае» толькі тады, калі заслона адкрыта і на яго скіраваны позіркі, а жыве на сцэне, пакуль тая вымагае ад яго творчасці. Мабыць, вялікае значэнне мае і кінематаграфічны вопыт, назапашаны Ф. Шмакавым: ён здымаўся ў фільмах «Узнятая цаліна» (Размётнаў), «Балтыйскае неба», «Качубей», «Анюціна дарога», «Крыніцы», «Першыя выпрабаванні», «Бессмяротная песня». Плюс да таго — рэжысёрская работа. Гэта ж шмакаўскім почыркам упісаны ў гісторыю тэатра імя Януба Коласа такія спектаклі, як «Бацькаўшчына», «Трывога», «РВС», «Шануй бацьку свайго». Працуючы з выканаўцамі роляў, Шмакаў-рэжысёр заўсёды такторна раскрывае патэнцыяльныя магчымасці знаёмага яму акцёра, падказвае, раіць, трывожыць фантазію. Мне гаварылі коласаўцы, што ён, бывае, знарок робіць выгляд, быццам сам не ведае, што ж тут і як трэба іграць, і тады пачынае разам з артыстам шукаць, спрачацца, «расчароўвацца» і... І, нарэшце, святкаваць перамогу: роля, як кажуць, «пайшла», яна «атрымалася», а тры дні назад проста немагчыма было прадказаць, ці застанецца яе выканаўцам менавіта гэты калега па трупе.

У летапісу коласаўцаў чырвонымі радкамі напісаны назвы спектакляў з вобразам Уладзіміра Ільіча Леніна. І тут, нібы падхапіўшы эстафету выканаўцаў адказнай ролі на беларускай сцэне — П. Малчанаў, А. Трус, — Ф. Шмакаў працягвае шуканні мастака, натхнёнага вялікай мэтай, мастака, які разумее, што аднаму артысту не пад сілу раскрыць усю веліч вобраза правадыра рэвалюцыі, што толькі калектыўны вопыт наблізіць некалі кагосьці да гэтай мэты. Асабліва плённымі былі такія шуканні вецебскага артыста ў спектаклі «Сям'я», потым ён выступаў у «Вечнай крыніцы», «Шостым ліпені» і «Трэцяй патэтычнай». Ён удзячны лёсу за тое, што гэты кірунак яго дзейнасці на сцэне прывёў яго да твораў Леніна, да першакрыніцы ленінскай мудрасці. Чытаючы філасофскія працы Уладзіміра Ільіча, Ф. Шмакаў па-мастацку асэнсоўвае багацце інтэлекту і хараство эмоцый генія чалавецтва, узорнага Камуніста на ўсе часы.

Віцябчане часта сустракаюць артыста на аэрадроме. Чакае чалавек свайго самалёта. Чытае газеты. Ходзіць і размаўляе сам з сабой. Пазірае ў блакіт, хаця б не было хмар, інакш спозніцца на здымкі кінафільма, на канферэнцыю БТА, я Ф. Шмакаў з тых людзей, што не спазняюцца і не з'яўляюцца раней часу, вызначанага адпаведным дакументам. Ён пунктуальны, калі закранаюцца творчыя справы, грамадзянскі абавязак. Аднойчы яго спыталі, што ён гаварыў сам сабе, калі чакаў рэйсу ў Мінск. Думалі, ён назаве ролю ў спектаклі. Фёдар Іванавіч усміхнуўся сваёй непаўторна добрай усмешкай і сказаў амаль шэптам: «Вучуна памяць вершык для малой... Дачка ў мяне... Трэба папаўняць рэпертуар для яе...»

Мне думаецца, што у гэтай будзённай заклапочанасці пра зямныя справы і ёсць творчы феномен таго, што наогул робіць у мастацтве гэты выдатны артыст. Яго творчасць адрасавана жывым людзям, у іх ён імкнецца абудзіць роздум пра навакольны свет, пра чалавечае прызначэнне, хоча ўсхваляваць іх кожным выступленнем на сцэне. Гэтаму яго вучыць само жыццё савецкага артыста, актыўнага прапагандыста перадавых ідэй сучаснасці. Гэта ён сам спасцігнуў як натуральную мэту мастакоўскай работы.

З ім любяць пагаварыць па-шчырасці маладыя калегі. Ён жартуе, прыгадвае выпадкі са свайго багатага на сустрэчы з хараством жыцця, паказвае штосьці з некалі ім сыгранага на сцэне. Маладыя смяюцца, задаюць пытанні, падхопліваюць жарты. Яны адчуваюць плячо сябра і старэйшага таварыша, з якім можна смела выпраўляцца разам у складаную творчую разведку. Камуніст — чалавек надзейны: у працы і ў баі, у творчасці і ў паходзе. Такі — Фёдар Шмакаў, дэлегат XXV з'езда камуністаў нашай краіны ад Віцебскай партыйнай арганізацыі.

Іван ЛІСНЕЎСКІ.

Пісьменнікі ў воінаў ЧБВА

Напярэдадні XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза частымі сталі сустрэчы пісьменнікаў з воінамі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Па запрашэнню камандавання і палітычных органаў літаратары выязджаюць у гарнізоны, сустракаюцца з асабовым саставам падраздзяленняў.

Нядаўна жаданымі гасцямі воінаў былі старшыня ваенна-шэфскай камісіі Саюза пісьменнікаў БССР Л. Прокша, генерал-маёр у адстаўцы М. Аляксееў, пісьменнік М. Кругавых.

Асабліва цёпла сустракалі ў адным з гарнізонаў М. Кругавых былыя аднапалчане пісьменніка — у той часці, дзе ён калісьці служыў старшыной, дзе пісаў свае першыя творы.

М. АЛЯКСЕЕЎ,
падпалкоўнік запасу.

У ГАСЦЯХ У БАБРУЙЧАН

«Натхнёнае слова пісьменніка — XXV з'езду КПСС» — пад такім дэвізам праходзілі літаратурныя сустрэчы беларускіх пісьменнікаў з працоўнымі Бабруйска. Асабліва цікавыя з іх былі ў гарадскім Доме настаўніка і ў Палацы культуры фанера - дрэваапрацоўчага камбіната.

Перад рабочымі выступілі Васіль Вітка і Сяргей Грахоўскі, якія ў юнацкія гады працавалі на прадпрыемстве, а таксама Мікола Аўрамчык і Мікола Лобан.

КАМУНІСТЫ Брэстчыны на абласной партыйнай канферэнцыі дэлегатам на XXV з'езд КПСС абралі свайго земляка лётчыка-касманаўта СССР, двойчы Героя Савецкага Саюза Пятра Ільіча Клімука.

Пётр Ільіч Клімук два разы пабываў у космасе, правёў вялікую навукова-даследчую работу, знаходзячыся доўгі час на касмічных караблях «Саюз-13» і «Саюз-18».

Касманаўта гасцінна сустракалі на Брэстчыне рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя. Яны з гонарам расказвалі яму аб вялікіх працоўных дасягненнях у дзевятай пяцігодцы і дастойнай сустрэчы XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

У гэты перадз'ездаўскі час Пётр Ільіч наведаў і сталіцу роднай Беларусі — горад-герой Мінск. Тут адбылася сустрэча П. І. Клімука са скульптарам І. Я. Міско, які робіць бюст лётчыка-касманаўта, двойчы Героя Савецкага Саюза, што будзе ўстаноўлены на яго радзіме.

Чытачам газеты «Літаратура і мастацтва» з найлепшымі пажаданнямі лётчык-касманаўт СССР
10.01.76 г.

СТВОРАНА Ў БРЭСЦЕ

«Захапляюча, цудоўна, праўдзіва», — такімі словамі запоўнены старонкі кнігі водгукаў пра юбілейную выстаўку аднаго з ветэранаў Брэсцкай арганізацыі Саюза мастакоў БССР Мікалая Аляксеевіча Аўчыннікава. Выстаўка прысвечана 70-годдзю з дня нараджэння і 35-годдзю яго творчай дзейнасці, якая пачалася ў 1940 годзе, калі ўпершыню ён выступіў са сваімі работамі на абласной выстаўцы прафесіянальных і самадзейных мастакоў, знаходзячыся ў той час у радах Савецкай Арміі.

У экспазіцыю выстаўкі ўвайшло звыш 100 работ розных жанраў — ад невялікіх замалёвак алоўкам перыяду Вялікай Айчыннай вайны да буйных тэматычных палотнаў апошняга часу.

Нават такое, на першы погляд, плакатнае, у стылі народнага лубка, фальклорнае вырашэнне тэмы, як у карціне «Полымя ленінскай «Искры», гаворыць пра тое, якую глыбокую, чыста народную задуму ўвасабляе мастак у простых, але канкрэтных вобразах.

У цэнтры кампазіцыі вылучаецца манументальны партрэт У. І. Леніна.

У левым сектары круга, пад разгорнутай, як сцяг, ленінскай «Искрой», што разгарэлася ў магутнае полымя Кастрычніка, мастак паказвае матросаў, салдат і рабочых - чырвонагвардзейцаў, якія толькі што прымалі ўдзел у штурме Зімняга і звяржэнні Часовага ўрада. У ніжнім і правым сектарах—народ, які святкуе перамогу Кастрычніка і радасна вітае будаўніцтва індустрыяльных гігантаў.

Уся кампазіцыя карціны, упісаная ў гэты жывы і вельмі разнастайны круг, шырока і ярка выяўляе галоўную думку твора — адзінства і адданасць савецкага народа ідэям ленінскай «Искры».

У наш час цяжка знайсці сур'ёзнага мастака, які не надаваў бы ў сваёй творчасці ўвагі вобразу У. І. Леніна. Вялікую цікавасць да ленінскай тэмы праяўляе брастаўчанін М. Аўчыннікаў. У прыватнасці, на яго юбілейнай выстаўцы дзевяць работ прысвечаны Леніну, прычым чатыры з іх выкананы ў 1975 годзе.

З апошніх работ асабліва хочацца адзначыць кампазіцыю «У. І. Ленін і Н. К. Крупская сярод дзяцей у Горках». Гэта карціна прасякнута цеплынёй, якая гаворыць аб вялікай любві Уладзіміра Ільіча і Надзежды Канстанцінаўны да дзяцей.

Цікавы таксама па думцы «Ленінскі трыпціх». У левай яго частцы—будан у Разліве, у сярэдняй — Ленін за работай над кнігамі, якія ён напісаў у Разліве, і нарэшце, у правай — фіксіруецца момант, калі Ленін і таварышы, якія яго суправаджаюць, сядаюць у лодку, каб адплыць з Разліва.

Да цікавых карцін, таксама напісаных у 1975 годзе, трэба аднесці драматычнае палатно «Радасная сустрэча і ўспаміны», у якой М. Аўчыннікаў вельмі ўсхвалявана паказаў момант радаснай сустрэчы дзвюх жанчын (відаць, маці і дачкі) пасля шматгадовай ростані. Іх разлучыла вайна, і вось праз 30 гадоў яны сустрэліся зноў. Душэўны стан гэтых ужо дарослых жанчын мастаку ўдалося перадаць з такой экспрэсіяй і ўнутранай пранікнёнасцю, што гледачы не маглі без хаавання ўспрымаць гэтую карціну.

Арк. СУРСКІ.

ТРЫ МЕЛОДЫІ ДОЙЛІДА

ПАДНІКОЛЛЕ — адзін з прыгажэйшых куткоў Магілёва, які прываблівае мастакоў і гасцей горада. Шырокая тапалёва-вярбовая лугавая пойма Дняпра. На гэтай пойме ўзвышаецца Мікалаеўская царква, помнік архітэктуры XVII стагоддзя (помнік адбіты на магілёўскіх сувенірных значках). Непадалёку ад Падніколля, на гэтым жа правабярэжжы, — гара Машэкі. З глыбіні стагоддзяў пачынаецца гісторыя горада на Дняпры. Аб далёкім мінулым Магілёва Янка Купала так пісаў у сваёй паэме «Магіла льва».

Над быстрым Днепрам, дзе сягоння
Стаяць Магілева муры,
Драмала пушча ў сотні гоняў,
Змагала громы і віхры.

Старажытныя будынкі. І — як працяг стагоддзяў і памкненне ў будучыню — новыя, сучасныя на месцы суцэльных руін і папялішчаў, якія пакінула вайна. Мікрараёны «Мір» і «Юбілейны». Новы праспект Міру з першым вышынным будынкам гасцініцы. Будынкі трох інстытутаў. Палац піянераў і кінатэатр «Кастрычнік» над Дубравенкай каля старажытнага гарадзішча, якое тут пазначана. А карпусы камбіната сінтэтычнага валакна і камбіната шаўковых тканін, якія выраслі зусім нядаўна! Задняпроўскі жыллёвы масіў...

Да ўсяго, што ўзведзена, пабудавана ў Магілёве апошнім часам, непасрэднае дачыненне мае Канстанцін Аляксееў, які восьмы год працуе ў Магілёве. Быў ён спачатку архітэктарам, а з 1971 года — галоўны архітэктар горада.

У кабінеце К. Аляксеева выстаўлены праекты новых збудаванняў. Усё перад вачамі, усё на віду. Працоўны дзень галоўнага архітэктара напружаны. Звяртаюцца, каб нешта ўзгадніць, за парадай — супрацоўнікі мясцовага філіяла «Белдзяржпраекта». Тэлефонныя званкі. Сувязі і адносіны з усімі, хто нешта будуе і праектуе. Шматлікія наведвальнікі.

Увесь «кабінетны» час ідзе на выкананне адміністрацыйных абавязкаў. Тут не разгорнеш аркуш ватману і не ўсядзешся з алоўкам думаць, чарціць, праектаваць тое, што руціць зрабіць самому. І ўсё ж Аляксееў нямала працуе як архітэктар. Па яго праектах узведзены 111-кватэрны дом і Дом санітарнай асветы па Першамайскай вуліцы ў Магілёве, адміністрацыйны будынак у Бабруйску. Неўзабаве ў Магілёве пачнецца будаўніцтва спраектаванага ім рэстарана, які будзе называцца «Габрава» — у гонар балгарскага горада-пабраціма.

У Магілёве і Мінску наладжваліся выстаўкі жывапісу Аляксеева. Так, Канстанціна Аляксеева, галоўнага архітэктара горада Магілёва. На апошняй абласной выстаўцы экспанаваецца некалькі яго работ, сярод іх —«Студэнтка». Увагу аматараў жывапісу прыцягвае запамінальны вобраз юнай сучасніцы. Знешне, можа, не такая ўжо яна прыгажуня. Звычайная дзяўчына, якую сустрэнеш і ў горадзе, і ў вёсцы. І менш за ўсё нагадвае яна паненку з белымі ручкамі. Такая і разумовую працу ведае, і ў студэнцкім будаўнічым атрадзе не апошняя. І ўсё ж у рысах твару, у поглядзе, ва ўсім, чым высвечваецца ўнутраны свет, ёсць нешта асаблівае, характэрнае. Мы адчуваем узлёт неспакойнай думкі і прадчуванне дарогі ў вялікае жыццё.

У маладога мастака многа работ, якія можна назваць гарадскім пейзажам. Гэта не толькі адлюстраванне цэглы і бетону ў пэўных будаўнічых канструкцыях. Горад жыве, дыхае ў зеляніце дрэў, у блакіце нябёсаў, у прыгожай анаясцы Дняпра і яго прытокаў. К. Аляксееў у меру сваіх сіл і таленту развівае новы жанр пейзажу, які займае сваё месца ў сучасным жывапісу. З лепшых работ хочацца адзначыць «Задняпроўе». Тут сапраўды арганічна ўпісваюцца ўсімі фарбамі і дэталямі ў адзінае цэлае неба, новыя дамы, зямля,вада, паветра. На маленькім астраўку, як дзень учарашні, стаяць прыцхілыя драўляныя домікі, — камусьці трэба будзе з імі развітвацца, і вось у наш настрой уплятаецца пасмачка смутку...

У майстэрні К. Аляксеева ёсць і скульптурныя работы. Разам з маладым скульптарам Міколам Кавалёвым ён працуе над стварэннем помнікаў, удзельнічае у конкурсах. Апошняя іх работа — рабочая мадэль помніка гераічнаму батальёну міліцыі, які да апошняга дыхання абараняў Магілёў летам 1941 года.

Як відаць, уся творчасць К. Аляксеева прысвечана Магілёву і Прыдняпроўскаму краю, у які ён па-сыноўняму ўлюбёны і якому аддае талент і творчае тарэнне. А сам ён нарадзіўся не ў Беларусі. Радзімай Аляксеева з'яўляецца далёкі таджыкскі горад Файзабад. Праўда, у Таджыкістане давялося жыць нядоўга. Чатырохгадовым хлопчыкам у 1947 годзе разам з бацькамі ён пераехаў у Мінскую вобласць (бацька працаваў у органах міліцыі). У Радашковічах скончыў сярэднюю школу. Затым пяць гадоў вучобы ў Мінскім політэхнічным інстытуце на архітэктурным аддзяленні і накіраванне ў Магілёў. Разлічваў, што ў Магілёве доўга не затрымаецца — вернецца ў Мінск (жонка ж мінчанка), а затрымаўся надоўга: спадабаўся Магілёў, людзі, Дняпро з яго маляўнічымі ваколіцамі. Усё гэта захапіла, стала родным і блізкім, дало ўзлёт натхненню і прастор для творчасці.

Аляксей ПЫСІН.

IV З'ЕЗД КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ БЕЛАРУСІ

ТВОРЧУЮ ЭНЕРГІЮ, ТАЛЕНТ

САВЕЦКАЯ рэчаіснасць, наш гераічны час — галоўная крыніца натхнення для беларускіх майстроў экрана. Асэнсаванне і адлюстраванне сродкамі кіно камуністычных ідэалаў, патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, працоўных здзяйсненняў савецкіх людзей, служэнне партыі і народу сваёй творчасцю — ганаровая і адказная місія мастака. Аб гэтым страсна і зацікаўлена гаварылі дэлегаты IV з'езда кінематаграфістаў Беларусі, які праходзіў у Мінску 11—12 лютага. Іх выступленні былі прасякнуты клопатамі аб развіцці кінематаграфіі ў Беларусі і павелічэнні яе ўкладу ў скарбніцу ўсяго савецкага кінамастацтва, аб вырашэнні адказных задач, якія стаяць перад майстрамі кіно, аб бязумоўным выкананні пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю савецкай кінематаграфіі».

Глыбокаму, дзелавому і прынцыповаму абмеркаванню важных праблем беларускага кіно садзейнічала, як адзначалася на з'ездзе, абстаноўка вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму ўсяго савецкага народа, выклікачага падрыхтоўкай да XXV з'езда КПСС. Перспектывы, якія адкрывае перад нашым грамадствам, перад кожным савецкім чалавекам праект ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады», не могуць не захапіць уяўленне мастакоў, якія жывуць аднымі думамі і клопатамі са сваім народам. Радкі гэтага партыйнага дакумента: «Забяспечыць далейшае павышэнне ролі сацыялістычнай культуры і мастацтва ў ідэйна-палітычным, маральным і эстэтычным выхаванні савецкіх людзей, фарміраванні іх духоўных запатрабаванняў» маюць непасрэдныя адносіны і да беларускіх кінематаграфістаў.

На неабходнасць больш глыбокага творчага даследавання працэсаў сучаснасці нацэліў дзеячаў мастацтва рэспублікі і XXVIII з'езд Кампартыі Беларусі, які закончыўся гэтымі днямі. «...ідэйна - выхаваўчы, жыццесцвярджальны патэнцыял нашай літаратуры, усіх відаў і жанраў мастацтва,—гаварыў у справаздачным дакладзе з'езду кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў, — узрасце яшчэ больш, калі яны праз глыбокае мастацкае адлюстраванне праблем сучаснасці стануць больш актыўна выводзіць нашых людзей на шырокія магістралі заўтрашняга дня, на вышыні будучыні, выконваючы высакародную місію духоўных разведчыкаў таго, што трэба будзе яшчэ зрабіць і стварыць, ажыццяўляючы ідэалы камунізму».

Дакументы з'езда з'яўляюцца для беларускіх майстроў кіно, падкрэсліваецца ў дакладзе праўлення Саюза кінематаграфістаў, з якім выступіў першы сакратар праўлення І. М. Дабралюбаў, не толькі кіраўніцтвам да дзеяння, але і сапраўды невычарпальнай крыніцай новых тэм і творчых задум, што павінны быць рэалізаваны ў фільмах, якія глыбока і ўсебакова раскрывалі б шматграннае жыццё нашага гераічнага народа.

Пяць гадоў мінула з часу папярэдняга з'езда кінематаграфістаў рэспублікі. Яны былі напоўнены напружанай творчай работай майстроў кіно, закліканых служыць сваім мастацтвам партыі і народу. Ведучы размову аб зробленым, дэлегаты з'езда падкрэслівалі пастаянныя клопаты партыі аб развіцці айчыннага кінематографа. Партыйнае кіраўніцтва кінамастацтвам забяспечвае яму высокую ідэйнасць, непрымірымасць да розных праяўленняў буржуазнай ідэалогіі, класавы падыход да ацэнкі творчасці. Нацэльваючы майстроў экрана на стварэнне значных твораў, якія глыбока і праўдзіва адлюстроўвалі б жыццё, партыя патрабуе ад кожнага мастака ўсё ўзрастаючай адказнасці за вынікі сваёй працы, за далейшы рост ідэйна-мастацкага ўзроўню нашага кінамастацтва.

За прайшоўшыя паміж з'ездамі гады створаны рад таленавітых твораў мастацкага і дакументальнага кіно, якія адлюстроўваюць значныя з'явы нашай рэчаіснасці, гераічныя этапы барацьбы і слаўных перамог савецкага народа, узнімаюць важныя праблемы сучаснасці.

Расшырыўся тэматычны дыяпазон ствараемых карцін, павысілася прафесіянальнае іх выкананне, што сведчыць аб творчым росце кадраў. Умацавалася матэрыяльная база кінавытворчасці: палепшана тэхнічнае аснашчэнне студый, абноўлена яе абсталяванне, у рэспубліцы за пяцігоддзе пабудавана 19 новых кінатэатраў амаль на 12 тысяч месц. Асігнаванні на развіццё кіно ў Беларусі, як паведаміў у сваім выступленні старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі У. В. Мацвееў, склалі за пяцігодку каля 17 мільёнаў рублёў. Цяпер у Беларусі дзейнічае звыш 10 тысяч дзяржаўных, прафсаюзных і ведамасных кінаўстановак. Датэрмінова выкананы пяцігадовы план па абслугоўванню насельніцтва, на дэманстрацыі кінафільмаў пабывала больш чым 590 мільёнаў гледачоў.

На кінастудыі «Беларусьфільм» за пяць гадоў створана 59 мастацкіх і тэлевізійных карцін і каля 250 кароткаметражных дакументальных, навукова-папулярных, мультыплікацыйных, вучэбных і іншых стужак. Беларускае кіно стала тэматычна багацейшым, жанрава больш разнастайным. Кінематаграфісты больш пільна ўглядаюцца ў жыццё сучасніка, больш паглыблена і ўдумліва ацэньваюць падзеі і факты гераічнай гісторыі нашага народа. Створаны фільмы, адзначаныя ўзнагародамі на ўсесаюзных і міжнародных фестывалях.

У зале з'езда.

ЭКРАННЫ ЛЕТАПІС ПОДЗВІГУ

Адной з галоўных тэм беларускага кінамастацтва па праву з'яўляецца героіка-патрыятычная тэма, раскрыццё подзвігу савецкага народа ў гады барацьбы супраць фашызму. Тут яно мае невычэрпную крыніцу жыццёвага матэрыялу, цікавага лёсу, яркіх прыкладаў савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму, неўміручых подзвігаў у імя Радзімы.

У адлюстраванні народнай героікі ў кінематографа ёсць бясспрэчныя дасягненні і плённыя традыцыі, пачатак якім у пасляваенныя гады быў пакладзены фільмамі «Канстанцін Заслонаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Дзяўчынка шукае бацьку». Затым яны былі прадоўжаны і развіты ў фільмах 60-х гадоў — у «Альпійскай баладзе», «Іване Макаравічу» і іншых.

У апошні час героіка-патрыятычны мастацкі летапіс у беларускім кіно папоўніўся новымі фільмамі. На першы план у іх выносяцца ідэйна-маральныя, маральна-этычныя аспекты барацьбы супраць фашызму. Гэта — «Бацька», «Паланез Агінскага», «Зэўтра будзе позна», «Доўгія вёрсты вайны», «Зімародак» і іншыя.

Сведчаннем плённасці творчых сувязей нашых кінематаграфістаў з іх калегамі па мастацтву з Балгарыі і Чэхаславакіі сталі карціны «Братушка» і «Маленькі сержант».

Развіваючы прынцыпы паглыбленага псіхалагічнага даследавання ваеннай тэмы, якія паслядоўна распрацоўваюцца ў творчасці беларускіх кінематаграфістаў, у апошнія гады майстры кіно бяруцца за маштабнае адлюстраванне яркіх старонак гераізму народа ў мінулай вайне. У фільмах В. Чацверыкова «Полымя» і «Руіны страляюць», заснаваных на дакумечтальным матэрыяле, на сапраўдных фактах гераічнай барацьбы супраць фашызму, разгорнута шырокая панарама, у якой дзейнічаюць не толькі асобныя героі, але і ўзнаўляецца калектыўны вобраз народа, які здзейсніў бясспрыкладны воінскі і маральны подзвіг.

Шматсерыйны тэлефільм «Руіны страляюць» адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР, а эпапея «Полымя» ўдастоена аднага з галоўных прызоў Усесаюзнага кінафестывалю ў Кішыневе.

Экранны летапіс подзвігу дастойна папоўнілі кінадакументалісты. Знята нямала цікавых, атрымаўшых прызнанне гледачоў карцін. Гэта, напрыклад, поўнаметражныя фільмы рэжысёра І. Вейнярэвіча «Балада аб мужнасці і любві» і «Магілёў. Дні і ночы мужнасці». Другі год рэжысёр В. Дашук працуе над цыклам фільмаў аб беларускіх Хатынях, аб спаленых вёсках і расстраляных дзецях, аб горкай памяці і не слабеючым з гадамі болі народным. У садружнасці з аўтарамі кнігі «Я з вогненнай вёскі» пісьменнікамі Я. Брылем, А. Адамовічам і У. Калеснікам ён зняў стужкі, якія атрымалі нядаўна Галоўны прыз на Усесаюзным фестывалі ў Кіеве. У іх з публіцыстычнай страснасцю раскрыты гераічны характар савецкага чалавека, які перажыў усе жахі фашызму, выстаяў і перамог у смяротнай барацьбе.

Цёпла былі прыняты гледачамі патрыятычная карціна аб героі грамадзянскай вайны начдыве В. Азіне, кінастужкі «Лілія — дачка Георгіцы», «Я, крэпасць, вяду бой», «Дзіяна беларускіх лясоў», «Жыць у вяках», «Аб чым шумяць дрэвы», «Бацька» і іншыя.

Цікавы вопыт стварэння фільмаў, якія спалучаюць дакументальны і іграны матэрыял. Гэты арыгінальны прыём, на думку кіназнаўцы В. Ф. Нячай, заслугоўвае пільнай увагі аўтараў будучых фільмаў, якія ўзялі на сябе смеласць узнавіць на экране сапраўдныя падзеі і лёс.

Пры мастацкім асэнсаванні гісторыі народа, гаварылі выступаўшыя, неабходна наглядна паказаць вытокі подзвігу, раскрыць маральны вопыт пакаленняў, важны для далейшага развіцця нашага грамадства. Новы час патрабуе глыбокага раскрыцця ўзаемасувязей асабістага і грамадскага, стварэння запамінальных вобразаў герояў, якія пакінулі яркі след у памяці пакаленняў.

ДАСЛЕДУЮЧЫ ГЛЫБІНІ ЖЫЦЦЯ

Першачарговай задачай кіно, як і ўсяго савецкага мастацтва, з'яўляецца адлюстраванне сучаснасці. Пры ўсёй шырыні самога паняцця «сучаснасць» гэта азначае, што стваральнікі фільмаў абавязаны звяртацца перш за ўсё да тых праблем жыцця, якія грамадства вырашае сёння і будзе вырашаць заўтра. Само сабой зразумела, што выбар тэмы, матэрыялу, пастаноўка праблемы — толькі зыходны момант асэнсавання сучаснасці. Поспех вызначае ўзровень творчасці на гэтым рашаючым напрамку, якасць твораў. Практыка сучаснага кінамастацтва паказвае, што толькі тыя стужкі аб сучаснасці ўваходзяць у мастацкую скарбонку народа, у якіх дзейнічаюць героі, духоўна багатыя, што стаяць на перадавых ідэйных пазіцыях.

У лепшых беларускіх карцінах намецілася вобраз героя-сучасніка — чалавека актыўнага, датычнага да тых вялікіх здзяйсненняў, якія складаюць сёння сутнасць жыцця краіны і рэспублікі.

Важныя маральныя праблемы, сённяшні дзень рэспублікі, рытм яе будняў і свят, штодзённае жыццё яе людзей-добра паказаны ў фільме «Час яе сыноў» рэжысёра В. Турава. Мяккі лірызм, паэтычнасць далі магчымасць вызначыць танальнасць гэтага своеасаблівага кінаапавядання, узнавіць думкі і пачуцці людзей вонкава стрыманых, сціплых, але духоўна багатых, маральна чыстых і бязмежна адданых сваёй справе.

У іншай творчай манеры вырашаны фільм «Сын старшыні», які нядаўна закончыў рэжысёр В. Нікіфараў. Праблемы сучаснай вёскі, жыццё яе людзей набылі ў гэтай карціне новае цікавае гучанне. Рэжысёру праз лёс працаўнікоў вёскі ўдалося знайсці шлях да больш шырокіх праблем сучаснасці, заглянуць у заўтрашні дзень беларускай вёскі.

Пошукі мастацкага кінематографа ў вырашэнні тэм сучаснасці дапаўняюць кінадакументалісты. Цікавы і своеасаблівы фільм рэжысёра Ю. Лысятава «Мы з Беларусі», які расказвае аб выдатных людзях рэспублікі.

З увагай аднесліся гледачы да цыкла карцін гэтага маладога рэжысёра аб рабочым класе — «Партызанскі праспект», «Паязды на шашы», «Я — мільённы» і «Мужчынскія галасы». Партрэт нашага земляка, лётчыка-касманаўта П. І. Клімука створаны ў лірычнай кінастужцы «Шлях да Арыёна» рэжысёрам Б. Сарахатунавым. Поызнанне грамадскасці атрымала карціна аднаго са старэйшых дакументалістаў рэспублікі У. Цеслюка «Слова аб партыйным білеце». Галоўнае ў гэтых фільмах — расказы аб ажыццяўленні рашэнняў XXIV з'езда КПСС, аб выкананні планаў дзевятай пяцігодкі, паказ небывалага ўзлёту айчыннай навукі і тэхнікі. Іх герой — наш сучаснік, чалавек працы, творэц навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

Выступаўшыя адзначалі і кароткаметражныя дакументальныя фільмы, створаныя за гэтыя гады В. Дашуком, — «Трывожныя вышыні», А. Канеўскім — «Апаленая памяць», Р. Дзодзіевай — «Суворавцы», І. Маргачовым — «Шэсць з пяці магчымых», С. Лук'янчыкавым — «Паляванне на золата». У мінулым годзе рэжысёр А. Колас зняла карціну «Марыя» — цёплае, лірычнае кінаапавяданне аб нашай сучасніцы, маладым калгасным механізатару, дэпутаце Вярхоўнага Савета БССР Марыі Жарко. Розныя па стылю, мастацкай манеры, выяўленчаму вырашэнню, гэтыя фільмы аб'яднаны агульным імкненнем аўтараў дастойна адлюстраваць на экране шматграннае жыццё нашых людзей.

Вельмі перспектыўны для стварэння арыгінальных фільмаў метад працяглага кінаназірання. Ён тоіць у сабе вялікія магчымасці, дазваляе пранікнуць у глыб з'яў, прааналізаваць іх. Прыкладам таму можа служыць карціна «Праз дзесяць гадоў, або трывогі і надзеі 10 «А» рэжысёраў В. Сукманава і Р. Ясінскага. Яна завяршыла унікальнае ў савецкім кіно дзесяцігадовае назіранне за адным з класаў 10-й сярэдняй школы г. Гомеля, за тым, як вучні авалодвалі ведамі, як фарміраваліся іх грамадзянскія якасці. Глядач змог прасачыць сам працэс сталення чалавека, убачыць станаўленне яго характару, фарміраванне поглядаў і звычак. Аўтары стужкі ўдастоены прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Спроба правесці працяглае кінаназіранне за будаўніцтвам Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода была зроблена рэжысёрам І. Пікманам, які зняў тут фільм «Брыгадзіры». І калі б гэта пачынанне атрымала працяг, у будучым удалося б стварыць поўнаметражную стужку — своеасаблівы сацыялагічны вопыт кінадаследавання тых змен, якія адбываюцца ў абліччы беларускага Палесся.

У ліку лепшых стужак на з'ездзе называлася і знятая рэжысёрамі І. Вейнярэвічам,

І ВЕДЫ — СЛУЖЭННЮ НАРОДУ

П. Аліфярэнкам і Р. Ясінскім поўнаметражная дакументальная стужка «Аб маці можна расказваць бясконца», прысвечаная Міжнароднаму году жанчыны. Яна складаецца з навел, кожная з якіх — хвалюючы кінарасказ аб вялікім жаночым лёсе. Стваральнікаў фільма цікавяць галоўныя рысы ў характары гераінь, яны стараюцца раскрыць іх духоўны свет, паказаць тыя чалавечыя якасці, якія робяць іх жыццё дастойным прыкладам для пераймання. Удала знойдзены ў карціне прыём вобразнага спалучэння розначасовага матэрыялу — гістарычнай хронікі і падзей нашых дзён.

Поспех гэтых кінастужак яшчэ раз сведчыць аб тым, што найбольшы ідэйна-мастацкі эфект дасягаецца ў тых дакументальных фільмах, дзе зліваюцца разам дакладны фактычны матэрыял з яркай і вобразнай паэтычнай метафарай, дзе падзеі і дакументы часу знаходзяць сацыяльнае і філасофскае абагульненне.

Разам з тым, пры прыкметных удачах асобных дакументальных фільмаў на тэмы сучаснасці, гаварылі дэлегаты, мастацкі ўзровень раду стужак застаецца пакуль што невысокім. Са 162 карцін, выпушчаных на экраны краіны і рэспублікі, толькі 61 стужцы прысвоена першая група. Многія фільмы носяць чыста ілюстрацыйны характар, фармальна адклікаюцца на важныя падзеі жыцця. Іх аўтары прыводзяць значныя факты без мастацкага асэнсавання, не бачаць за імі важных сацыяльных з'яў. Такія, скажам, карціны, як «Першы марш», «Гектар збожжа», «Цана аднаго працэнта» і некаторыя іншыя, грашаць апісальнасцю, у іх няма характараў людзей, а ёсць толькі дзеючыя асобы.

Дакументальнае кіно рэдка бярэцца за публіцыстычныя творы, якія ўзнімалі б вострыя праблемы сучаснасці, актуальныя пытанні росту эканомікі і культуры, развіцця грамадскіх адносін.

Вялікая роля ў эстэтычным і маральным выхаванні людзей тэлевізійнага кіно, адзначалі выступаўшыя. Фільмы «малога» экрана збіраюць велізарную аўдыторыю і могуць уздзейнічаць адначасова на розумы і пачуцці мільёнаў людзей. Майстры тэлевізійнага кіно імкнуліся знаёміць гледачоў з героямі пяцігодкі, лепшымі людзьмі заводаў і ферм. Цікавыя ў гэтым плане дакументальныя тэлевізійныя стужкі «Справа жыцця», «Размова аб зямлі», «Докшыцкі каравай» і некаторыя іншыя, якія паказваюць партрэты нашых сучаснікаў, людзей нялёгкай хлебаробскай працы, настойлівых, шукаючых, верных свайму абавязку і прызванню.

Спробы вырашаць тэмы сучаснасці рабіліся і ігравым тэлевізійным кіно. Створана цікавая карціна «Вашынгтонскі карэспандэнт», звернутая да вострых падзей палітычнага жыцця Амерыкі. Зняты таксама фільмы «Верыш — не верыш», «Вялікія перагоны», «Ідучыя за гарызонт», «Быць чалавекам» і іншыя. На жаль, аўтарам іх не ўдалося дабіцца поспеху. Прычына няўдач — слабая драматургія, ад якой ідзе і далейшая павярхоўная і схематычная трактоўка праблем, падкрэслівалі ў сваіх выступленнях рэжысёры М. Н. Пташук, Б. К. Сарахатунаў, Л. В. Мартынюк і іншыя.

З усіх беларускіх фільмаў, тэматычна звернутых да сучаснасці, толькі нямногія па свайму зместу, па закладзенаму ў іх сацыяльнаму і эстэтычнаму зараду. з'яўляюцца сапраўды сучаснымі творамі, адзначалася на з'ездзе. Шэрагу карцін не хапае вышыні думак і пачуццяў. Нярэдка сцэнарысты і пастаноўшчыкі абмяжоўваюцца беглымі замалёўкамі таго ці іншага боку сучаснага жыцця, канстатуюць наяўнасць праблемы, але не ўмеюць яе даследаваць праз людскі лёс, індывідуальныя характары. У асобных фільмах сучаснасць і сучаснік паказваюцца толькі з вонкавага боку — у пейзажах і антуражы. Часам аўтары карцін займаюцца адлюстраваннем прыватных сямейна-бытавых гісторый, якія не маюць сур'ёзнай грамадскай цікавасці.

Партыя заклікае мастакоў глыбока асэнсоўваць і ярка адлюстроўваць здзяйсненні сучаснага этапа камуністычнага будаўніцтва, багацце ўнутранага свету савецкіх людзей, савецкі лад жыцця, маральныя каштоўнасці нашага грамадства, сказаў кіназнаўца А. В. Красінскі. Ні адну з гэтых задач нельга вырашыць паспяхова без творчага гарэння, без глыбокага ведання жыцця, пастаянных пошукаў адпаведных драматургічных і рэжысёрскіх прыёмаў, жанравага абнаўлення. Самому жыццю, яго дыялектыцы проціпаказана рамесніцкая статыка, ілюстрацыйнае бытаапісальніцтва. Асноўная прычына няўдач раду карцін аб сучаснасці якраз і заключаецца ў гэтых апошніх акалічнасцях. Калі ж мастак з гарачым сэрцам і страснасцю грамадзяніна ўскрывае глыбінныя пласты жыцця, пры ўсіх творчых выдатках ён дабіваецца поспехаў, выводзіць на экран неардынарных герояў.

Уся вобразная сістэма кіно павінна быць звернута на тое, каб больш глыбока пранікаць у жыццё, у характары людзей, усебакова даследаваць сацыяльную і маральную прыроду канфліктаў. Век навукова-тэхнічнай рэвалюцыі выстаўляе перад мастакамі задачу быць гранічна пераканаўчымі, не дэкларатарамі прапісных ісцін, а адкрывальнікамі новага. Гэта датычыць у роўнай ступені як стваральнікаў дакументальных фільмаў, так і ігравых.

ПОЗІРК, СКІРАВАНЫ Ў ЗАЎТРА

Партыя паставіла перад савецкім народам задачу зрабіць дзесятую пяцігодку пяцігодкай якасці і эфектыўнасці работы. Гэта патрабаванне мае самае непасрэднае дачыненне да майстроў кіно, якія прадстаўляюць сваю прадукцыю на суд мільёнаў людзей. І, гаворачы аб праблемах заўтрашняга дня беларускага кінематографа, дэлегаты з'езда шмат увагі ўдзялілі пытанням павышэння якасці будучых карцін. «Мы не можам лічыць здавальняючым той факт, што побач з сапраўднымі, высокамастацкімі творамі кінамастацтва з'яўляюцца нязначныя па зместу, невыразныя па форме, без свайго аблічча стужкі,—сказала кінакрытык Е. Л. Бондарава. — Калі падыходзіць да нашай прадукцыі з высокімі меркамі, то толькі трэць яе можна было б атэставаць на Знак якасці».

У чым прычына такога становішча? Адназначнага адказу на гэта пытанне няма. Якасць жа фільма складаецца з многіх кампанентаў — добрай драматургічнай асновы, таленту і кваліфікацыі рэжысёра, мастака, аператара, многіх іншых спецыялістаў і тэхнічных магчымасцей студыі. Залежыць яна і ад тых творчых крытэрыяў, якімі кіруюцца стваральнікі карціны.

На жаль, праблема дабротнага сцэнарыя стаіць сёння яшчэ востра. У кінематограф яшчэ слаба прыцягваюцца беларускія пісьменнікі і журналісты, хоць наяўны вопыт работы з такімі літаратарамі, як В. Быкаў, А. Вялюгін, К. Губарэвіч, А. Куляшоў, М. Лужанін, А. Макаёнак, А. Асіпенка, І. Чыгрынаў, І. Шамякін і іншыя, ужо даў станоўчыя вынікі. У вырашэнні сцэнарнай праблемы неабходна зацікаўленасць і актыўная дапамога ўсіх творчых арганізацый рэспублікі. У распрацоўцы гадавых і перспектыўных тэматычных планаў павінны ўдзельнічаць не толькі кінематаграфісты, але і пісьменнікі, журналісты, партыйныя і савецкія работнікі.

Дэлегаты з'езда нямала ўвагі ўдзялілі праблемам ідэйнай і прафесіянальнай падрыхтоўкі творчых кадраў, маладой змены. Той колькасці спецыялістаў, якая ёсць сёння на студыі, недастаткова для якаснага выканання вытворчай праграмы.

Патрэбна кваліфікаванае папаўненне, прыток свежых сіл. Пошук таленавітых мастакоў, вядома, вядзецца. Студыя ў апошнія гады папоўнілася вялікай групай маладых, здольных кінематаграфістаў, якія ўжо цяпер вызначаюць аблічча беларускага кіно. Аднак патэнцыяльныя магчымасці наяўных творчых сіл, асабліва моладзі, выкарыстоўваюцца пакуль у недастатковай меры. Удзельнікі з'езда выказвалі трывогу ў сувязі з тым, што пры вялікай перагрузцы вопытных кінематаграфістаў маладыя нярэдка ходзяць у «запасных» або займаюцца нятворчай работай. Рэжысёры В. Т. Тураў, В. А. Нікіфараў, аператар Ю. А. Марухін і іншыя адзначалі, што трэба больш давяраць пачынаючым, не баяцца эксперыменту, даваць магчымасць маладым талентам раскрыць сябе ў поўнай меры. Толькі пры гэтай умове можна чакаць з'яўлення цікавых фільмаў, а разам з імі і новых імён тэматычных аўтараў.

Рэжысёр Р. Ясінскі, аператар В. Гарбуноў (Эстонія), рэжысёр Х. Якубаў (Туркменія), і аператар В. Арлоў.

Але трэба сказаць, што і пошук рэзерваў вядзецца пакуль што яшчэ непланамерна, ад выпадку ад выпадку. Неабходны старанны адбор моладзі, падрыхтоўка яе да паступлення ва УДІК, на вышэйшыя рэжысёрскія курсы і вышэйшыя курсы кінадраматургаў. Трэба знаёміцца з будучымі выпускнікамі яшчэ ў сценах інстытута, запрашаць іх на вытворчую практыку, «упісваючы» маладога рэжысёра або аператара ў калектыў студыі.

Папаўненне кадраў рэжысёраў, аператараў і іншых спецыялістаў кіно магчыма, на думку рэжысёра У. М. Стральцова, і за лік кінаматараў. Атрад работнікаў «малога» кіно, аб'яднаных у 122 студыях, налічвае сёння больш чым 1.300 энтузіястаў. Многія са знятых імі фільмаў — сведчанне здольнасці аўтараў. Але кінааматарам патрэбна метадычная, творчая і тэхнічная дапамога прафесіянальных майстроў.

Важнай формай падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, гаварылася на з'ездзе, з'яўляецца настаўніцтва. Яно ўжо атрымала прапіску на кінастудыі: двухсерыйная тэлевізійная стужка «Дзяніскіны расказы» здымаецца групай вопытных і маладых рэжысёраў, аператараў і мастакоў.

Праблема якасці фільма ў немалой меры залежыць і ад акцёраў. У рэспубліцы шмат вядомых майстроў тэатра і кіно, такіх, як А. Клімава, З. Стома, В. Тарасаў, М. Яроменка і іншыя. Яны з поспехам здымаюцца ў карцінах, але, на жаль, пастаўленых, як правіла, на іншых студыях. Кінематограф у вялікім даўгу перад гэтымі і многімі іншымі акцёрамі беларускай сцэны, моладдзю тэатра і, як ні дзіўна, перад сваімі, штатнымі акцёрамі, якія мала заняты работай у кіно.

Неабходна шырэй прыцягваць у кінематограф вядучых беларускіх артыстаў, больш актыўна дапамагаць раскрываць творчыя магчымасці маладым выканаўцам, больш давяраць прафесіянальным кінаакцёрам студыі. У гэтым плане многае можа зрабіць створаная нядаўна ў Саюзе кінематаграфістаў БССР творчая секцыя кінаакцёра.

На з'ездзе ішла размова і аб тым, што якасць кінапрадукцыі ў немалой ступені абумоўлена таксама вытворчай базай. А яе магчымасці, на жаль, сёння абмежаваны. Здымачная, гукавая тэхніка, апаратура і абсталяванне ўстарэлі, патрабуюць замены. Вядома, абнаўленне кінатэхнікі адбываецца, студыя атрымлівае новае, больш дасканалае абсталяванне, але расце і вытворчая праграма. Не дзіўна, што ў апошні час сталі частымі прэтэнзіі да тэхнічнай якасці беларускіх фільмаў.

Як відаць, наспела неабходнасць пераходу студыі на новую сістэму планавання і эканамічнага стымулявання, якая дасць магчымасць вырашыць і рад іншых праблем кінавытворчасці, а ў канчатковым выніку— паляпшэнне яе якасці. Гэта дапаможа вырашэнню і сацыяльна-бытавых праблем, якія таксама востра стаяць перад калектывам студыі.

Аднак ужо цяпер можна зрабіць нямала. Не сакрэт, што далёка не ўсе магчымасці вытворчай базы выкарыстоўваюцца рацыянальна. Задачы кіраўніцтва студыі — усямерна павысіць эфектыўнасць вытворчасці, якасць работы ўсіх службаў і падраздзяленняў. Гэта патрабаванне часу, цяперашняй пяцігодкі.

У дакладзе і выступленнях дэлегатаў з'езда падкрэслівалася вялікае значэнне крытыкі ў павышэнні якасці мастацкіх і дакументальных стужак. Пастанова ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы» садзейнічала актывізацыі работы кіназнаўцаў і кінакрытыкаў рэспублікі. Выдадзены рад кніг аб гісторыі беларускай кінематаграфіі, яе актуальных праблемах. У мінулым годзе ў выдавецтве «Мастацтва» выйшаў зборнік «Кіно Савецкай Беларусі», у якім даецца шырокае ўяўленне аб мінулым і сучасным кінамастацтва рэспублікі, аб людзях і фільмах, традыцыях, пошуках і праблемах. У ім зроблена спроба не толькі асэнсаваць, ацаніць мінулае, але і намеціць новыя перспектывы.

Аднак многія актуальныя праблемы драматургіі, рэжысуры, выяўленчага і тэхнічнага рашэнняў фільмаў, акцёрскага майстэрства, успрымання гледачоў асветлены яшчэ недастаткова поўна. Інтарэсы далейшага развіцця кінамастацтва ў Беларусі, задачы павышэння ідэйна-мастацкага ўзроўню ствараемых стужак патрабуюць яшчэ больш актыўнага ўдзелу кіназнаўцаў і кінакрытыкаў. Іх неабходна прыцягваць да работы над фільмам ад моманту нараджэння карціны да выпуску яе на шырокі экран. Гэта дапаможа больш прафесіянальна весці размову аб якасці, значэнні і каштоўнасці ствараемага фільма. Без крытыкі ж і самакрытыкі, без патрабавальных адносін да сябе і сваёй справы, як вучыць партыя, немагчымы рост майстэрства работнікаў, яго плённая дзейнасць.

(Заканчэнне на стар. 12).

Старэйшыя кінематаграфісты Я. Сакалоў, Л. Голуб, П. Шамшур.

XXV Дэлегаты з'езда

«БАЧУ ЗЯЛЁНЫ...»

ЗРАМУАЛЬДАМ Антонавічам Матусевічам я ўпершыню сустрэўся на гарадскім злёце перадавікоў вытворчасці. Сярэдняга росту, моцны мужчына ў форме чыгуначніка, не спяшаючыся, узняўся на сцэну. Зала, ужо злёгку стомленая выступленнямі, спачатку слухала яго не вельмі ўважліва — прысутных не проста было здзівіць самымі высокімі лічбамі працоўных рэкордаў.

Заўважыўшы гэта, Рамуальд Антонавіч адсунуў убок прыгатаваны тэкст прамовы і павёў шчыры расказ пра сябе, сваіх таварышаў. Гаварыў ён нядоўга — усяго нейкіх пяць хвілін. І ўвесь гэты час у зале стаяла насцярожаная цішыня. А пасля яна літаральна ўзарвалася апладысментамі.

Пішу гэтыя радкі і думаю: чаму так горача было сустрэта яго выступленне? І міжволі ўспамінаецца: «Кожны знойдзе сваё шчасце, калі будзе жыць сумленна, па нашых савецкіх законах». Так гаварыў машыніст. Гаварыў крыху ўсхвалявана, упэўнена. У пацвярджэнне сваёй думкі прывёў усяго некалькі прыкладаў з аўтабіяграфіі, біяграфій таварышаў па дэпо. Проста і ярка сказаў пра тое, пра што ў гэты дзень хацелі б сказаць усе прысутныя ў зале.

Пазней я некалькі разоў сустракаўся з Рамуальдам Антонавічам. І ўсё больш пераконваўся, што яго словы тады не былі ўсплёскам хвіліннага святэчнага натхнення. Яны ішлі ад сэрца, праверэныя і даказаныя ўсім яго жыццём.

Нарадзіўся Р. А. Матусевіч на Лагойшчыне, да вайны паспеў закончыць пяць класаў, быў партызанам, служыў у арміі. Апошнюю чвэрць веку водзіць паязды. Вось і ўся біяграфія. Змесціцца цалкам на адной старонцы са школьнага сшытка. Але жыццё на адной старонцы не ўмесціш. А ў лістку па ўліку кадраў вяма пытанняў пра тое, да чаго імкнуўся, што сцвярджаў, з чым змагаўся.

Тысячы людзей розных спецыяльнасцей абслугоўвае ўчастак магістралі «Мінск—Брэст». Многія з іх ведаюць Матусевіча як аднаго з лепшых машыністаў Беларускай чыгункі. Адзінаццаць гадоў водзіць ён міжнародныя скорасныя паязды. І водзіць на «выдатна».

Для кожнага машыніста, асабліва для «скорасніка», галоўнае — графік руху. І калі слесар-лякальшчык «ловіць» на сваім рабочым месцы мікроны, то машыніст — секунды. Тут Рамуальд Антонавіч майстар, якіх трэба пашукаць. Не было выпадку, каб яго поезд спазніўся да месца прызначэння. А вось уводзіць у графік спознены састаў, правесці яго так, каб пры любым надворʼі, на любым участку не страціць ні хвіліны і сэканоміць сотню-другую кілаграмаў паліва — гэта яму па душы. За дзевятую пяцігодку ён зберог больш за 4 цэнтнеры паліва. Не менш высокая лічба значыцца ў яго абавязацельствах і на дзесятую пяцігодку. А калі кожны машыніст дэпо стане такім жа майстрам эканоміі. Тады краіна дадаткова атрымае цэлыя саставы «чорнага золата». Гэта і ёсць «далёкі прыцэл» машыніста.

...Роўна ў 6 гадзін 15 хвілін Рамуальд Антонавіч стаіць на звычным месцы ў самым канцы перона — сустракае «свой» поезд. Цеплавоз спыняецца акурат побач. Дружныя прывітанні экіпажа смалян, перадача дакументаў, агляд машыны і поезд плаўна кранаецца з месца. У ранішнім прыцемку знікае апошні вагон. Р. А. Матусевіч у чарговым рэйсе. Якім ён будзе? Напэўна, звычайны — у чымсьці цяжкі, у чымсьці радасны. Але пры любых абставінах поезд «Усход—Захад» (так называюць яго чыгуначнікі) сустрэнуць у Брэсце хвіліна ў хвіліну.

А цяпер ён у дарозе. Рамуальд Антонавіч быццам урос у крэсла, пільна ўглядаецца ў наплываючыя рэйкі. За акном цеплавоза мільгаюць паўстанкі, пасёлкі, лясныя прасекі, у якіх не-не ды і праскочыць заяц, а часам трывожна застыне лось. І толькі птушак не палохае імклівы бег састава: яны вылятаюць з-над самых колаў, часам неасцярожна. І тады машыніст чуе глухія ўдары аб корпус цеплавоза.

— Зялёны, сто дваццаць, — гучыць голас памочніка, калі здалёк убачыць светафор.

— Зялёны, сто дваццаць,—звыкла зазначае Рамуальд Антонавіч і паглядае на спідометр. Безумоўна, ён і сам бачыць светафор, і цвёрда ведае, што на гэтым участку хуткасць «сто дваццаць». Але такі парадак: памочнік павінен нагадаць машыністу гэтыя звесткі, а машыніст паўтарыць іх.

Прыкладна гадзіны праз тры састаў будзе ў Брэсце. Далей яго павядзе другая брыгада. Цеплавоз прымуць электрыкі, слесары, запраўшчыкі, а Рамуальд Антонавіч пойдзе ў гасцініцу. Абед, адна, другая партыя ў шахматы, сон, агляд цеплавоза і ў шлях назад. У дзве гадзіны ночы асцярожна, каб не пабудзіць жонку, машыніст адчыніць дзверы сваёй кватэры. Рэйс закончаны.

— Ну як, спадабалася паездка? — спытаў Рамуальд Антонавіч у мяне пасля таго, як я пабываў пасажырам у яго на цеплавозе.

— Вельмі спадабалася, — адказаў я. — Але, бадай, крыху стамляльна... Адзін-другі раз праехаць, вядома, цікава.

— Магчыма. Але для мяне кожны рэйс па-свойму цікавы. Колькі разоў прасілі, пераконвалі стаць машыністам-інструктарам. Не магу...

Неўзабаве я зноў сустрэўся з дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, дэлегатам XXV з'езда КПСС Рамуальдам Антонавічам Матусевічам. Ён збіраўся на сустрэчу са школьнікамі.

На здымку: Р. А. Матусевіч.

Я папрасіў Рамуальда Антонавіча прачытаць гэтую замалёўку.

— Як быццам усё правільна, — сказаў ён. — Хачу толькі заўважыць, што гэта расказ не толькі пра мяне, але і пра лепшага слесара дэпо Уладзіміра Крука, які таксама падлеткам пайшоў у партызаны; пра дэлегата XXIV з'езда КПСС Аркадзя Граковіча, усю сям'ю яго расстралялі фашысты. Наш лёс, працоўныя біяграфіі ў многім падобныя. Ды ці толькі ж нашы?

Ю. ГУМЯНЮК.

«СТУЖКА ДРУЖБЫ-75»— БЕЛАРУСКАМУ РАДЫЁТЭАТРУ

Днямі намеснік старшыні Дзяржкамітэта СМ БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню М. А. Суша ўручыў Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё «Стужку дружбы-75». Гэтай штогадовай узнагароды Дзяржтэлерадыё Літоўскай ССР адзначаны радыёспектакль «Паслухай сваё сэрца», створаны па аповесці І. Шклярэўскага «Грыбная пара» (рэжысёр С. Гурыч).

— Гэта не першая ўзнагарода Беларускага радыётэатра, — гаворыць галоўны рэдактар Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё В. А. Лукша.—Чацвёрты год запар атрымліваем мы прызы — «Стужкі дружбы» — сваіх літоўскіх калег. У 1972 годзе сярод трох лепшых спектакляў радыёслухачы Літвы назвалі «Самы высокі паверх», створаны па аднайменнай аповесці А. Савіцкага, затым лаўрэатамі сталі п'еса А. Пінчука «Такая служба», «І нічога ўзамен» па аповесці А. Савіцкага такой жа назвы.

Нашы лепшыя радыёпастаноўкі гучалі таксама па ўсесаюзным радыё, цёпла сустрэты слухачамі Украіны, Малдавіі, Латвіі, Узбекістана...

У апошні час мы вынеслі на суд слухачоў і атрымалі ад іх добрыя водгукі на радыёпастаноўкі «Мая радня» па раману А. Савіцкага «Жанчына», «Беларуская калыханка» па паэме В. Віткі, «Іду па вуліцы Пуліхава» Ул. Мехава.

Рыхтуецца да пастаноўкі радыёспектакль у чатырох частках па раману І. Мележа «Мінскі напрамак», «Развітанне ў Кавальцах» па аповесці І. Навуменкі, «Новая зямля» па паэме Я. Коласа, «Міша Магнацкі і яго сябры» па аповесці В. Мысліўца «Гарачая сталь», арыгінальныя радыёп'есы «Чырвань нашага сцяга» і «Свае крылы». Думаем ажыццявіць пастаноўку ў этэрэафанічным гучанні «Калі прылятаюць чорныя буслы»: пра ахову прыроды — на тэму сучасную, надзённую.

IV З'ЕЗД КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ БЕЛАРУСІ

ТВОРЧУЮ ЭНЕРГІЮ, ТАЛЕНТ І ВЕДЫ—СЛУЖЭННЮ НАРОДУ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 10).

Шмат месца ў дакладзе і выступленнях дэлегатаў з'езда было адведзена павышэнню дзейснасці беларускага кіно. Добра, калі дакументальны, а тым больш мастацкі кінематограф, адзначалі прамоўцы, жыва адгукаецца на актуальныя праблемы сучаснасці, заўважае новае ў жыцці грамадства і выносіць яго на экран. Пры абавязковай умове, што фільм зроблены на высокім ідэйна-мастацкім і эстэтычным узроўні,— тады ўздзеянне яго на розум і сэрцы гледачоў будзе асабліва моцным і эфектыўным.

Вастрыня ідэалагічнай барацьбы ў свеце патрабуе ад мастака актыўнага ўмяшання ў жыццё. Што пад гэтым падразумяваецца? Водгук на хвалюючыя падзеі часу траціць сваю важнасць і вастрыню, калі фільм даходзіць да гледача са спазненнем. Мала своечасова заўважыць і адлюстраваць новае, неабходна аператыўна данесці яго да гледача, зрабіць здабыткам усіх, тым самым пашыраючы гэта новае, станоўчае. Неабходна смела выкрываць і выносіць на грамадскі суд чужыя нашаму грамадству з'явы, догмы буржуазнай ідэалогіі, паказваючы яе заганы і язвы. У гэтым аспекце трэба больш гібка, мабільна будаваць тэматычныя планы — так, каб беларускае кіно стала сапраўдным выхавацелем мас.

Адзначалася таксама, што беларускія кінематаграфісты атрымалі выдатны падарунак— рэспубліканскі Дом кіно, аднак яго магчымасці ў прапагандысцкай і выхаваўчай рабоце выкарыстоўваюцца далёка не дастаткова.

У выступленнях дэлегатаў з'езда рэжысёраў І. Н. Вейняровіча, П. П. Шамшура, аператара Ю. Н. Шалімава і іншых разглядаліся таксама праблемы жанравай разнастайнасці кінастужак, прынцыпова ўзнімаліся пытанні паляпшэння дзейнасці Саюза кінематаграфістаў, выяўляліся нявыкарыстаныя рэзервы павышэння эфектыўнасці працы творчых і тэхнічных работнікаў.

З цёплымі словамі прывітання да ўдзельнікаў з'езда звярнуліся сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў СССР І. В. Таланкін, галоўны рэдактар Дзяржкіно СССР Д. І. Арлоў, прадстаўнікі саюзаў кінематаграфістаў Украіны — рэжысёр В. П. Сычэўскі, Узбекістана — кінадраматург С. А. Абдукахараў, Латвіі — рэжысёр У. Браун, якія адзначылі, што ў апошнія гады беларускае кіно па праву заняло дастойнае месца ў савецкай шматнацыянальнай кінематаграфіі. Яны падкрэслівалі, што майстры экрана рэспублікі паслядоўна і пасляхова распрацоўваюць адну з важнейшых тэм — тэму вайны і подзвігу. Госці сардэчна павіншавалі сваіх калег са знамянальнай падзеяй — IV з'ездам кінематаграфістаў Беларусі і пажадалі ім новых творчых дасягненняў і адкрыццяў.

IV з'езд кінематаграфістаў Беларусі яшчэ раз пераканаўча прадэманстраваў, што майстры кіно рэспублікі поўныя рашучасці з гонарам выканаць задачы, якія стаяць перад імі, аддаць усю сваю творчую энергію, талент і веды служэнню партыі і народу, унесці дастойны ўклад у духоўную скарбніцу савецкай сацыялістычнай культуры.

Гэта знайшло адлюстраванне ў рэзалюцыі з'езда, у пісьме дэлегатаў Цэнтральнаму Камітэту КПСС, у якім дзеячы беларускага кіно запэўніваюць, што прыкладуць усе сілы для стварэння высокаідэйных і мастацка дасканалых твораў, будуць актыўна садзейнічаць павышэнню ролі кінамастацтва ў камуністычным будаўніцтве, у выхаванні новага чалавека.

В. БІРУКОЎ,
Я. ГАРЭЛІК,
спец. кар. БЕЛТА.

ЦУДОЎНАЯ ЯВА

У ТУЮ РАНІЦУ на стане трактарнай брыгады толькі і было гаворкі, што пра канцэрт мастацкай самадзейнасці, на якім механізатары пабывалі напярэдадні ў калгасным Доме культуры.

У асаблівым захапленні былі яны ад п'есы «Родны дом», якую паказаў драмкалектыў. Хлопцы абкружылі трактарыста Аляксея Русінава, аднаго з самадзейных артыстаў, паціскалі яму рукі.

— Малайчына, Лёша, — гаварылі адны.

— Добра сыграў, — хвалілі іншыя.

Аляксей усміхаўся і дзякаваў за віншаванні.

Прайшло некалькі хвілін. Хлопцы разышліся па машынах. Загуў адзін трактар, другі, трэці... І вось па дарозе пацягнуліся ў заснежанае поле да тарфяных буртоў машыны з санямі і цялежкамі. Адзін з трактараў вёў Аляксей Русінаў.

Хлопец ён малады, але лічыцца ў калгасе імя Калініна адным з самых вопытных механізатараў. Машына яго заўсёды спраўная, нормы перавыконвае з дня на дзень. Ну, а па вечарах ідзе Аляксей на рэпетыцыі ў калгасны Дом культуры, што ў самым цэнтры Снова. Ідзе па вуліцы і думае, як змянілася іх вёска за апошнія гады. Гэта ж больш за 250 калгаснікаў атрымалі новыя кватэры. Ды якія — з водаправодам, газам, паравым ацяпленнем. Такую кватэру атрымаў нядаўна і ён, маладажон.

...А ў Доме культуры гучыць музыка, бегаюць у танцавальных касцюмах хлопцы і дзяўчаты. Яны таксама прыйшлі на рэпетыцыю. Дарэчы, гэта самы малады самадзейны калектыў калгаса. Арганізаваў і кіруе ім шафёр Міхаіл Нячай. У арміі ён танцаваў у салдацкім ансамблі, а цяпер перадае сваё майстэрства, сваю любоў да танца моладзі.

На раённым аглядзе калгасныя танцоры з поспехам выканалі «Кадрылю», «Беларускую польку», «Плясавую».

У мастацкай самадзейнасці калгаса сёння прымае ўдзел звыш пяцідзесяці чалавек. Сярод іх механізатары, паляводы, настаўнікі мясцовай школы, спецыялісты сельскай гаспадаркі.

Заўсёды збірае шматлікую аўдыторыю агітбрыгада, якая называецца «Гаспадарскае вока». Кожны нумар выконваецца пад смех, гарачыя апладысменты. Дзіва што ўдзельнікі брыгады добра ведаюць кожную дробязь у калгасе, як хто працуе, як хто сябе паводзіць. І таму-сяму ў глядзельнай зале бывае сорамна падняць вочы. Так прапясочаць у частушцы, што толькі трымайся.

Калгасную агітбрыгаду добра ведаюць ва ўсім раёне, не раз выступала яна ў раённым Доме культуры. Члены яе заваявалі права ўдзельнічаць у занальным аглядзе мастацкай самадзейнасці, які пройдзе ў рамках Усесаюзнага фестывалю.

Хораша спяваецца, весела танцуецца, калі светла, спакойна на душы, калі ўсё ў чалавека ладзіцца. А як жа інакш можа быць у калінінцаў: калгас іх славіцца на ўсю рэспубліку высокімі ўраджаямі, добрай прадуктыўнасцю жывёлы. За гады дзевятай пяцігодкі ўраджайнасць збожжавых узрасла з 32 цэнтнераў да 40,6, бульбы са 158—да 215 з гектара. За гэты час вытворчасць малака і мяса амаль падвоілася.

У калгасе падлічылі — для перавозкі сельскагаспадарчай прадукцыі, атрыманай толькі летась, спатрэбілася о каля 600 чыгуначных вагонаў.

А як вырасла культура вёскі, як змяніўся да лепшага яе побыт. Некалі тут, у цёмным кутку Заходняй Беларусі, пісьменных людзей можна было пералічыць па пальцах. Цяпер толькі ў Снове, цэнтральнай сядзібе калгаса, жыве каля 100 чалавек з вышэйшай адукацыяй. Дзеці былых беднякоў і батракоў сталі настаўнікамі, інжынерамі, урачамі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі.

Вось і нядаўна вярнуліся дадому з дыпломамі інжынераў былыя калгасныя стыпендыяты Сяргей Шарапа і Мікалай Курыла.

Што ўражвае чалавека, які не быў тут усяго некалькі гадоў, дык гэта калгасныя новабудоўлі.

Калі ў свой час калгас заключыў дагавор з Беларускім навукова-даследчым і праектна-разведачным інстытутам па будаўніцтву ў вёсцы, распрацаваны архітэктурны праект здаваўся нейкім фантастычным відовішчам.

Сёння значная частка праекта ўвасоблена ў цэглу, бетон, шкло. А наперадзе яшчэ больш грандыёзныя здзяйснені. Ужо сёлета будзе здадзены ў эксплуатацыю зімовы плавальны басейн; расшыраецца спартыўны комплекс. Плануецца пабудаваць сад-яслі на 250 месц. За ўтрыманне дзяцей бацькі тут не будуць нічога плаціць, усе расходы бярэ на сябе калгас.

Вось такая яна, сённяшняя ява калгаса.

М. МІХАЙЛАЎ.

Нясвіжскі раён.

Калгасныя харысты.

Закружыліся ў танцы...

Звініць аркестр.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

СЛУЦКАЯ ТКАЧЫХА

Мы не раз бачылі яе на тэлеэкране, імя яе называюць на мастацкіх саветах Міністэрства мясцовай прамысловасці. Гэта Ганна Іванаўна Паляшчук — народная майстрыха традыцыйнага ткацтва Случчыны.

Жыве яна ў вёсцы Макраны Капыльскага раёна, а родам з Пінщчыны. Цяжкім было ранейшае становішча яе бацькоў, палескіх сялян. Ганна Іванаўна нарадзілася пры Савецкай уладзе. Жыццё на Палессі наладжвалася, моладзь імкнулася ў культурныя цэнтры. Пачала сваю вучобу ў Лунінецкім сельгастэхнікуме і Ганна Іванаўна. Але вайна перарвала навуку камсамолкі. На фронце была камандзірам сандружыны, шмат жыццяў выратавала і сама падвяргалася смяротнай небяспецы. Прыгаворана была нават да расстрэлу, але партызаны выратавалі яе.

Пасля вайны вярнулася ў свой родны калгас, працавала там да 1953 года: старыя раны далі сябе адчуць. Успомніла, як у дзяцінстве, у вёсцы, у доўгія зімовыя вечары яе маці і бабка ткалі прыгожыя вырабы на ткацкім станку — «кроснах», які стаяў у іх хаце. Часта маці вучыла дзяўчынку правільна перабіраць нацягнутыя ніткі льняной асновы. На ўсё жыццё запомніліся яе ўрокі. Асноўным матэрыялам для ткацтва здаўна служылі лён, каноплі, воўна, з іх ткалі палатно для адзення, абрусы, іншыя рэчы. Паставіла ў хаце Ганна Іванаўна «кросны» і стала ствараць узоры роднага Палесся, ткаць посцілкі, ручнікі. Атрымлівалася нядрэнна — падабалася самой і людзям. У яе хаце, нібы з агню і попелу пасля страшэннай вайны, нарадзіліся і расквітнелі першыя яе работы.

Заўважылі ў раёне народную майстрыху, запрасілі працаваць на дагаворных умовах на Случкай фабрыцы мастацкіх вырабаў. Пачала вышывальшчыцай і ткачыхай, а цяпер, на працягу многіх гадоў, узначальвае брыгаду ткачых.

Таленавітая майстрыха сама распрацоўвае ўзоры — эталоны для новых вырабаў, якія выпускае фабрыка.

Яна пастаянная ўдзельніца раённых, абласных, рэспубліканскіх выставак народнай творчасці. За высокае майстэрства выканання, захаванне і развіццё народнага ткацтва сваёй мясцовасці Ганна Іванаўна ўзнагароджана дыпломамі, граматамі, грашовымі прэміямі. У 1974 годзе дэманстравала свае вырабы на ВДНГ СССР — на «Свяце народных талентаў». Яе вырабы экспанаваліся на міжнародных выстаўках у Манрэалі, Лейпцыгу, Токіо. Цяпер Ганна Іванаўна рыхтуе свае вырабы на выстаўкі, прысвечаныя Усесаюзнаму фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных і на рэспубліканскую абменную выстаўку ў Вільнюсе.

Майстрыха прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці фабрыкі, яна з'яўляецца прафоргам групы ткачых.

Ганна Іванаўна выдатная маці, жонка. Яе чацвёра дзяцей атрымалі сярэднюю і спецыяльную адукацыю.

Мы прыносім вялікую ўдзячнасць захавальніцы народнага майстэрства Случчыны — Ганне Іванаўне Паляшчук.

А. КРАСІЧКАВА,
старшы метадыст Дома мастацкай самадзейнасці Белсаўпрофа.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА»

«ЯК ПЕРААДОЛЕЦЬ ІНЕРТНАСЦЬ»

У нумары 49 за мінулы год пад такім загалоўкам быў змешчаны артыкул Р. Пратасевіча аб рабоце краязнаўчых музеяў і музеяў на грамадскіх пачатках Брэсцкай вобласці.

Начальнік упраўлення культуры Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў працоўных В. Клімук лічыць, што «ў артыкуле своечасова ўзняты надзённыя пытанні паляпшэння работы музеяў, а таксама рад праблем арганізацыі музеяў у раёнах вобласці на грамадскіх пачатках».

Як паведамляе далей В. Клімук, артыкул гэты абмеркаваны на семінары дырэктараў музеяў вобласці, які адбыўся 12 студзеня г. г. Кіраўнікам музеяў дадзены рэкамендацыі, як палепшыць падрыхтоўку кадраў для грамадскіх музеяў вобласці, як найлепш умацоўваць сувязі з партыйнымі і савецкімі арганізацыямі з тым, каб разам праводзіць работу па камуністычнаму выхаванню працоўных.

У першым квартале гэтага года раённыя музеі вобласці правядуць семінары з кіраўнікамі грамадскіх музеяў сваіх зон. Такі семінар, напрыклад, праведзены ўжо Баранавіцкім краязнаўчым музеем.

Гарадскім і раённым аддзелам культуры прапанавана сістэматычна аказваць практычную дапамогу грамадскім музеям у арганізацыі экспазіцыйнай і масава-асветнай работы.

Сёння асноўная ўвага краязнаўчых музеяў вобласці скіравана на шырокую прапаганду праекта ЦК КПСС да XXV з'езда партыі «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады». Усе дзяржаўныя музеі арганізавалі стацыянарныя і перасоўныя выстаўкі «Ад з'езда да з'езда».

«НЕДАРАВАЛЬНЫ НЕДАГЛЯД»

Так называлася рэпліка, апублікаваная на старонках штотыднёвіка ў № 50 за мінулы год, у якой крытыкавалася праграма да спектакля «Пратакол аднаго пасяджэння».

Дырэктар Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы І. Міхалюта паведаміў рэдакцыі, што факт сапраўды меў месца ў тэатры. Роль касіра, супрацоўніка аддзела працы і зарплаты і Валеркі рэжысёрам скасаваны перад самай прэм'ерай, калі ўжо былі надрукаваны праграмкі. Па нявопытнасці памочніка галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы не ўключаны ў праграму перакладчык Р. Бярозкін і аўтар музыкі С. Картэс. Усё гэта было заўважана пры абмеркаванні прэм'еры.

Па гэтаму факту ў тэатры зроблены адпаведныя захады.

Аляксандр ПАДАБЕД

ПАРТЫЗАНСКАЕ ЗАДАННЕ

Сілу памяці дзіцячых гадоў звычайна тлумачаць тым, што дзяцінства — залатая пара, у якой увесь свет уяўляецца яснай веснавой раніцай. Не бяруся аспрэчваць гэта. Але і згадзіцца таксама не магу. Таму што свет майго дзяцінства не быў бязвоблачны і безмяцежны. Яго апаліла вайна. І мацней водару веснавых лугоў мне запомніўся парахавы гар.

Калі ў мой родны край уварваліся варожыя полчышчы, мне было адзінаццаць гадоў. І адразу ж незнаёмае паняцце «акупацыя» стала штодзённай жахлівай рэальнасцю. І ўжо чаго-чаго, а таго, што давялося перажыць у той цяжкі час, мне не забыць ніколі. Гэта і цяпер бачыцца ва ўсіх падрабязнасцях.

Вось, да прыкладу, вяртаюся я падвечар дамоў. Думкі мае яшчэ заняты службаю. І раптам іх нітка абрываецца. Ля дома хлопчыкі гуляюць у вайну. Ганяюцца адзін за адным, «страчаць» са сваіх «аўтаматаў», напаўняючы двор гучнагалосым «та-та-та-тах!» І тут я зноў бачу сябе: нібыта бягу ўздоўж чыгуначнага палатна, а мне наўздагон б'е такое ж вось «та-та-та-тах!» Толькі грыміць яно куды больш гучна і рэзка, вырываючыся не з вуснаў хлапчука, а з варанёнай кулі нямецкага аўтамата. І зноў я чую посвіст куль, якія зразаюць галінкі кустоў, міма якіх я бягу.

Цяпер і самому не верыцца, што такое было са мною, хлапчуком з беларускай вёскі, які паспеў перад вайною скончыць усяго толькі чатыры класы. Аднак было гэта, было!

У наша сяло, што згубілася ў лясах Міншчыны, фашысты прыйшлі ў пачатку ліпеня 1941 года. І адразу з'явіліся іх загады з папярэджаннем аб расстрэлах. Пакаранне смерцю пагражала за ўсё. І ў першую чаргу за захаванне зброі, у тым ліку і паляўнічай. А мы з брацікам Славікам якраз толькі тым тады і займаліся, што збіралі зброю. Вечарамі мы ўпотай выбіраліся з сяла і на месцах нядаўніх баёў адшуквалі вінтоўкі, пісталеты, патроны, старанна іх хавалі. Рабілі гэта для партызан. Яны ж вельмі хутка з'явіліся ў нашых лясах.

Я і сам марыў уступіць у атрад народных мсціўцаў. Аднак у партызан, якія час ад часу прыходзілі ў сяло, на ўсе мае настойлівыя, нават слёзныя просьбы адказ быў адзін: «Малы яшчэ, падрасці трэба!» І больш года я заставаўся, як тады лічыў, у баку ад сапраўдных спраў. Тое, што мне часам даручалі да кагосьці збегаць і нешта перадаць, я за справу не лічыў, з гэтым усякая дзяўчынка магла справіцца. Вось калі б мне далі зброю, каб самому страляць па фашысцкіх гадах! Хіба я ў школе задарма атрымаў значок «Юны варашылаўскі стралок»?

Але, на жаль, у атрад мяне не бралі. І толькі восенню сорак другога года мне, нарэшце, даверылі першае баявое заданне. Даў яго Васіль Мітрафанавіч Ярмілаў, які неўзабаве стаў палітрукам адной з рот партызанскага атрада, што дзейнічаў у Пухавіцкім раёне. І перш чым павесці гаворку пра справу, ён яшчэ палічыў патрэбным папярэдзіць мяне самым строгім чынам.

— Язык за зубамі трымаць умееш?

— Умею! — выпаліў я.

— А ты не спяшайся, падумай ды ўяві, што будзе, калі трапіш у лапы гестапаўцам. Будуць жа біць, катаваць... Як тады? Вытрымаеш?

— Вытрымаю! Нікога не выдам.

— Ну, глядзі ж... Памятай пра сваё слова!

Толькі пасля такога папярэджання Васіль Мітрафанавіч растлумачыў, што ад мяне патрабавалася. Апошняй перашкодай на шляху, па якім дастаўляліся ў атрад боепрыпасы, гаручае, прадукты харчавання і медыкаменты, быў у тыя дні пераезд праз чыгунку, які называўся Асееўскім. Ён амаль заўсёды знаходзіўся пад аховаю. Кожны чалавек, кожная павозка тут спыняліся і абшукваліся. Прапускаліся праз пераезд толькі тыя, хто меў пры сабе «аўсвайсы», якія выдаваліся нямецкай камендатурай.

Акрамя салдат - вартаўнікоў, на пераездзе дзяжурыў яшчэ і будачнік. Ён старанна прыслужваў захопнікам. Калі гітлераўцы адлучаліся з пераезда, каб агледзець чыгуначны пуць, то ўсіх праходзячых і праязджаючых правяраў гэты тып.

— Справа твая няхітрая, прасцей паранай рэпы, — сказаў мне Ярмілаў. — Будзеш сачыць за пераездам. І як толькі там ні салдата, ні будачніка не стане, — адразу ж дай сігнал Валі Маркоўскай. Ты ж яе ведаеш? Дык гэта яна паедзе ў атрад з падводай.

Валю я ведаў. Быў таксама знаёмы і з будачнікам. Яшчэ раней той жа Ярмілаў загадаў мне «пасябраваць» з ім. «Гэта можа спатрэбіцца», — сказаў Васіль Мітрафанавіч. І я, каб увайсці ў давер'е да гэтага панурага і ўзлаванага на ўсіх вяскоўцаў чалавека, імкнуўся ўсяляк дагадзіць яму. Насіў ваду, калоў і цягаў дровы, паліў у будцы грубку, у якой ён гатаваў сваю ежу. І што вы думаеце? З часам я ўвайшоў у давер'е да будачніка і ён пачаў лічыць мяне «сваім». А таму мне і не забаранялася слаяцца паблізу Асееўскага пераезда.

І вось я слаяюся. Нібыта так, без усялякай мэты. А сам між тым пазіраю то на пераезд, то на хмызняк, дзе прытаілася Валя Маркоўская са сваёй падводаю. Пазіраю ды яшчэ раз прыкідваю: ад хмызняку, дзе схавалася Валя, да лесу, што за пераездам, — метраў чатырыста. Конь з гружанай павозкаю такі шлях асіліць за тры мінуты. Значыцца, я павінен даць Валі сігнал толькі ў тым выпадку, калі буду ўпэўнены, што менавіта на такі тэрмін пераезд застанецца без вартаўнікоў.

А вартаўнікі ўсё яшчэ тырчаць там. Добра, што няма будачніка — ён пайшоў за прадуктамі. Але колькі ж будуць сядзець ля шлагбаўма гэтыя два салдаты?

Але вось, нарэшце, насунуўшы глыбей каскі, вартаўнікі ўстаюць, ідуць правяраць пуць. Яшчэ крыху, і іх ужо не відаць — яны схаваліся за паваротам. «Пара!» — махаю я Валі рукою. Яна адразу ж выязджае. І раптам — на табе! З-за павароту, за якім толькі што схаваліся вартаўнікі, выкатваецца дрызіна з механічным прывадам. На ёй — два аўтаматчыкі. Яшчэ імгненне, і яны ўбачаць нашу падводу, спыняць, абшукаюць. А на падводзе — я гэта ведаў — гаручае і ружэйнае масла.

Што рабіць? Як захаваць Валю з яе небяспечным грузам? Дрызіну яна яшчэ не бачыць. Ды і павярнуць ёй назад позна — не паспее. І я рашаюся адцягнуць увагу фашыстаў на сябе. Выскокваю на пераезд і бягу ўздоўж чыгуначнага палатна на вачах у салдат. «Хальт!» — нясецца мне наўздагон. Я не спыняюся, бягу хутчэй. «Хальт! Хальт! Хендэ хох!» Азірнуўшыся, бачу: гітлераўцы саскочылі з дрызіны, бягуць за мною, ускідваюць аўтаматы. «Вось і ўсё, — мільгае думка. — Цяпер дадуць чаргу і заб'юць...»

«Та-та-та-тах!» — аглушальна бухае за спіною. Ля скроняў свішчуць кулі, пад ногі падаюць збітыя імі галінкі. Нібы спатыкнуўшыся, я спыняюся...

Ці адчуваў я жах у тое імгненне? Няхай чытач не палічыць мяне выхвалякаю, але, паклаўшы руку на сэрца, скажу: тады страху не было. Ён прыйшоў пазней. А ў тое імгненне мне чамусьці здавалася, што ўсё адбываецца не са мною, што агонь фашыстаў выклікаў на сябе не я, а нехта іншы. Вобразна кажучы, у тую мінуту я ўсведамляў і адчуваў самога сябе ў трэцяй асобе.

...Уцякаць ад гітлераўцаў я не думаў. Я імкнуўся толькі пабольш затрымаць іх увагу. І таму спыніўся, узняў рукі. Фашысты схапілі мяне, прыцягнулі ў будку, пачалі біць і абшукваць. Але тут, на маё шчасце, падаспеў будачнік. Па-нямецку гаварыў ён добра. Пачаў салдатам нешта даказваць, ківаючы на мяне. Тыя спачатку з ім спрачаліся, а потым, даўшы мне яшчэ пару разоў па зубах, выкінулі з будкі.

Не памятаю, як я, увесь пабіты, дабраўся дадому. Толькі там ачуняў і, уявіце сабе, толькі там ахапіў мяне страх — жыццё ж маё было на валаску. Гэты страх дапамагла мне пераадолець думка аб тым, што заданне партызан я ўсё ж выканаў, што дзякуючы майму ўчынку (не, зусім не гераічнаму, а проста па-хлапечы адчайнаму) патрэбны партызанам груз паспяхова перапраўлены праз Асееўскі пераезд.

Праз дзень са мною сустрэўся Ярмілаў. Пахваліў мяне і сказаў, што з гэтага часу я магу з поўным правам лічыць сябе партызанскім сувязным.

Я ганарыўся такім давер'ем і, каб апраўдаць яго, імкнуўся дакладна выконваць кожнае заданне. А заданні выпадалі розныя. Часцей за ўсё такія, што не патрабавалі асаблівай рызыкі. Даручалася, напрыклад, распаўсюджваць сярод жыхароў навакольных сёл і вёсак лістоўкі са зводкамі Саўінфармбюро. Гэта, шчыра кажучы, было не так ужо складана. Толькі не трапляй на вочы паліцаям. А людзі нашы сустракалі мяне радасна, як нашталь'ёна, які прынёс добрыя весткі.

Але з часам мне даверылі справу і больш цяжкую. Тыя ж лістоўкі я павінен быў расклейваць у людных месцах. А гэта было звязана з немалой рызыкай. Пападзіся я ў рукі гестапаўцам ды апазнай яны мяне, — пакаранне смерцю не мінаваць ні мне, ні маім родным.

І вось жа здарылася, што я ледзь не папаўся. А было гэта так.

Майскім днём 1943 года мяне накіравалі на станцыю Міханавічы з адной адзінай лістоўкаю. Яе трэба было прыклеіць не дзе-небудзь, а на дзвярах, што вялі ў залу чакання. Калі б я дачакаўся цемры — усё было б проста. Але калі я прыйшоў на станцыю, то выпадкова даведаўся, што к вечару чакаецца прыбыццё сюды эшалона эсэсаўцаў. Што рабіць? Пайсці, не выканаўшы задання? Ні ў якім разе!

Выходжу на прывакзальную плошчу. Там, акрамя некалькіх бабуль з кайстрамі, нікога не бачу. Асмялеўшы, падбіраюся да ўваходу ў залу чакання. Дастаю лістоўку, загадзя змазаную клеем, і ўсёй далонню прыціскаю яе да дзвярэй. Потым яшчэ разгладжваю ражкі, каб трымалася мацней. Вось і ўсё. Справа зроблена. Можна ісці. І раптам нехта хапае мяне за каўнер пінжака. Паварочваюся і бачу бамбізу з вусікамі «пад фюрэра». За плячом у яго карабін, на левым рукаве — павязка са свастыкай.

Паліцай усміхаецца, радуецца. Яшчэ б! Для яго я здабыча, за якую яго чакае ўзнагарода. А што чакае мяне? Страшна ўявіць... І адкуль ён з'явіўся, гэты паліцай?

Спрабую вырвацца. Але паліцай трымае моцна, хаця і адной рукою. Другой ён здзірае лістоўку. Асцярожна, каб не парваць.

Ададраўшы, нарэшце, лістоўку, паліцай цягне мяне на перон, у канцы якога маячыць чорная фігура гестапаўца. Я плятуся побач з рэйкамі. А па іх, замаруджваючы ход, рухаецца таварняк. Стукаюць колы, стукае маё сэрца, стукае кроў у скронях... І раптам я заўважаю, што пінжачок-та на мне расхрыстаны, усе гузікі расшпіленыя.

Далей усё адбываецца ў адно імгненне. Адкінуўшы рукі назад, я колькі было сілы вырываюся з уласнага пінжака, пакідаючы яго ў руках паліцая. І тут жа кідаюся пад вагон поезда, што ішоў. Паспяваю перад самым колам перакуліцца праз рэйку і прыціснуцца да шпалаў. Над мною праплывае вагон, насоўваецца наступны. І як толькі прамільгнулі колы пярэдняй восі, я зноў перакульваюся праз рэйку, але толькі на іншы бок.

А «мой» паліцай кідаецца па пероне, заглядае пад вагоны, крычыць: «Стой, прыстралю!» Таварняк яшчэ рухаецца, і ныруць пад вагон, як зрабіў я, паліцай не адважваецца.

Ускочыўшы на ногі, што ёсць сілы ўцякаю далей ад палатна. Бягу гародамі ў лес, які мяне схавае, выратуе, не выдасць.

Мне наўздагон грымяць стрэлы...

Так, вялікая сіла ў памяці дзіцячых гадоў. Шмат розных падзей захавалася ў ёй. І мацней, больш выразна — тыя два імгненні, калі мне, хлапчуку, партызанскаму сувязному, давялося выклікаць на сябе варожы агонь.

Сяргей Пятровіч КАТКОЎ

Беларускае савецкае мастацтва панесла цяжкую страту. 17 лютага 1976 года памёр заслужаны настаўнік БССР, член праўлення Саюза мастакоў БССР, камуніст, таленавіты жывапісец, выдатны педагог, які выхаваў не адно пакаленне беларускіх мастакоў, добры і душэўны чалавек, Сяргей Пятровіч Каткоў.

С. П. Каткоў нарадзіўся і кастрычніка 1911 года ў вёсцы Скрыпіцына былой Саратаўскай губерні, у 1933 годзе скончыў Пензенскі мастацка-педагагічны тэхнікум.

У гады Вялікай Айчыннай вайны С. П. Каткоў знаходзіўся ў радах Савецкай Арміі, змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і японскімі мілітарыстамі, ён быў адзначаны многімі баявымі ўзнагародамі.

З 1937 года мастак — педагог і кіраўнік студыі выяўленчага мастацтва пры Мінскім Палацы піянераў. Ён стварыў кнігу «Вачамі дзяцей».

Усё жыццё С. П. Каткова — гэта самаадданае служэнне мастацтву і людзям. Ім намаляваны сотні жывапісных палотнаў, прысвечаных роднаму краю, перадаўзоранаму рукамі савецкага чалавека. Як педагог, ён праводзіў вялікую работу па эстэтычнаму выхаванню падрастаючага пакалення, прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі шматлікіх выставак дзіцячага малюнка.

За заслугі перад Радзімай С. П. Каткоў узнагароджаны васьмю медалямі, Ганаровай граматай і граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

Светлая памяць аб цудоўным чалавеку і мастаку назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто яго ведаў.

Праўленне Саюза мастакоў БССР.

ПАПРАУКА

У артыкуле «Па шляхах памяці», надрукаваным у № 6 за 1976 год, памылкова ўказана, што аўтарам праекта, якія атрымалі першую прамію, даручана далейшая распрацоўка праекта мемарыяльнага комплексу «Партызанская слава».

З розных шырот

«Гаянэ» на фінскай сцэне

На сцэне фінскай нацыянальнай оперы адбылася прэм'ера балета Арама Хачатурана «Гаянэ». Гэта ўжо другі харэаграфічны спектакль савецкага камназітара ў сталіцы Фінляндыі. Першым быў пастаўлены савецкім балетмайстрам А. Дадзішкіліяні ў 1971 годзе балет «Спартак». Спектакль меў тады вялікі поспех.

— Я некалькі гадоў выношвала планы пастаноўкі «Гаянэ», — сказала карэспандэнту ТАСС балетмайстар фінскай оперы Эльза Сюльвестэрсан, якую тэатральны крытык буйнейшай газеты «Хельсінгін санамат» ахарактарызаваў як аднаго з вядучых майстроў фінскага балета. — І вось, нарэшце, мая мара збылася.

У 14 гадоў я ўжо танцавала на галоўнай сцэне оперы ў Хельсінкі. Любімы мой балет — «Лебядзінае возера» Чайкоўскага. З балетнай трупай я пабывала ў Ленінградзе, Кіеве, Мінску і іншых гарадах Савецкага Саюза. Мы адчулі, як любяць і разумеюць у вас балет. Нашым артыстам, вядома, давялася вельмі старацца, каб апраўдаць давер'е такога гледача...

У 1968 годзе балерына закончыла выступленні на сцэне, але не пайшла з тэатра: адкрыўся яе талент харэаграфа-пастаноўшчыка. Яшчэ балерынай Э. Сюльвестэрсан спрабавала ставіць невялікія балетныя спектаклі.

— Гэта была для мяне добрая школа, — гаворыць яна, — але недастатковая. Давялося засесці за падручнікі па балету. Многае ўзяла з такіх кніг, як «Искусство балетмейстера» Р. Захарава...

І вось «Гаянэ». Гэта ўжо 22-я мая пастаноўка. Сярод іх і балеты савецкіх аўтараў, напрыклад, «Легенда пра каханне» Мелікава, «Атэла» Мачаварыяні. Хаця я даўно і многа думала аб пастаноўцы «Гаянэ», ды ўдалося ажыццявіць гэтую задуму толькі цяпер. Летась у жніўні мы пабывалі з дырыжорам Хары Дамгардам у Маскве ў А. Хачатурана. Падрабязна абмеркавалі будучую пастаноўку, і кампазітар адобрыў нашы планы...

«Глядач,— указвала ў гэтай сувязі «Хельсінгін санамат»,—не раз прыходзіў у захапленне ад вынаходніцтва, музычнасці, прыгажосці ў рухах танцораў, ад усёй работы балетмайстра». Газета падкрэслівала, што музыка Арама Хачатурана зноў пацвердзіла старую ісціну: калі яна бярэ свае вытокі ў народа, то зноў з удзячнасцю да яго і вяртаецца. «Цікавы, — пісала газета,— і сюжэт балета, ярка намаляваныя характары дзейных асоб, добра акрэслены канфлікт. Гледачы, захопленыя музыкай, з захапленнем сочаць за ходам спектакля».

«Прыма-балерына Сея Сільверберг выканала партыю Гаянэ на высокім узроўні», — адзначала газета «Хювудстадсбладэт». Крытыка адзначыла таксама ўдалы дэбют у адной з галоўных роляў Юркі Ярвінена.

— А вашы планы на будучыню? — задаю пытанне Э. Сюльвестэрсан.

— Хачу паставіць балет Сяргея Пракоф'ева «Рамэо і Джульета».

Н. ГАРБУНОЎ.
Хельсінкі. кар. ТАСС.

Падарунак Марка Твэна

Добры падарунак да 100-годдзя выхаду ў свет адной з самых любімых дзіцячых кніг ва ўсім свеце «Прыгоды Тома Сойера», якое адзначаецца ў гэтым годзе ў ЗША, падрыхтаваў дом-музей Марка Твэна. Супрацоўнікам музея ўдалося, нарэшце, адшукаць арыгінал вядомай ілюстрацыі да кнігі вялікага пісьменніка пра сябра і прыхільніка Тома Сойера — Гекльберы Фіна, якая была надрукавана ў першым лонданскім выданні кнігі «Прыгоды Гекльберы Фіна» ў 1884 годзе. На малюнку мастака Эдварда Кембла, які па просьбе самога М. Твэна ілюстраваў яго творы, паказаны Гекльберы Фін у сваім падраным адзенні. Ён стаіць, абапіраючыся на старую паляўнічую стрэльбу, і трымае ў другой руцэ забітага труса. Гэты малюнак, які абышоў пазней многія іншыя выданні «Прыгоды Гекльберы Фіна» па ўсім свеце, быў, як лічылі, беззваротна згублены, і работнікі музея Марка Твэна ўжо страцілі надзею на тое, што калі-небудзь яго адшукаюць.

Аказалася, што арыгінальны малюнак праляжаў усе 84 гады там, дзе ён быў пакінуты самім пісьменнікам, а менавіта ў доме архітэктара Лесінга Уільямса, з бацькам якога пісьменнік быў у цесных прыяцельскіх адносінах. Бацька архітэктара Томас Уільямс быў упраўляючым кніжнага выдавецтва «Чарльз Уэбстэр компані», у якім выдаваліся «Прыгоды Гекльберы Фіна» і іншыя творы Марка Твэна.

80-гадовы архітэктар успамінае, што М. Твэн часта бываў у доме яго бацькі ў прыгарадзе Нью-Йорка — Фар-Ракуэ. Аднойчы пісьменнік увайшоў у дзіцячую, дзе на падлозе гуляла сястра Л. Уільямса Джудзіт, якой тады было ўсяго паўтара гады. У руках Марка Твэна была яго кніга пра Гекльберы Фіна, адкрытая на той старонцы, дзе была славутая ілюстрацыя. Джудзіт, якая да гэтага нічога не гаварыла, акрамя «мама» і «тата», раптам пацягнулася да малюнка, вымаўляючы выразна: «Гек Фін, Гек Фін». Марк Твэн быў настолькі здзіўлены тым, што дзіця пасля першых слоў «мама» і «тата» вымавіла імя яго героя, што на наступны дзень прынёс арыгінальны малюнак з прысвячэннем: «Заўсёды твой, Марк Твэн» і падарыў яго Джудзіт.

Пасля смерці Джудзіт падарунак Марка Твэна перайшоў да Л. Уільямса, які, паводле яго слоў, хацеў ужо перадаць малюнак у музей Марка Твэна. Аднак, калі 20 гадоў назад ён наведаў дом-музей пісьменніка, ён не зрабіў гэтага.

У тыя гады музей Марка Твэна перажываў крызіс. Пасля смерці пісьменніка ў 1910 годзе дом, у якім ён жыў, станавіўся то школай, то складам для вугалю, то бібліятэкай, то жылым домам. Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі пачаліся работы па рэстаўрацыі дома, каб зрабіць яго такім, якім ён быў пры жыцці вялікага пісьменніка.

«Цяпер я са спакойнай душою перадаю гэты арыгінальны партрэт Гекльберы Фіна дому-музею Марка Твэна, мяркуючы, што ён зойме ганаровае месца ў музеі аднаго з найвялікшых гумарыстаў Амерыкі», — сказаў Л. Уільямс.

В. БАЙДАШЫН,
кар. ТАСС.
Нью-Йорк.

ЧЫЛІ: КУЛЬТУРНАЯ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЯ

Назначаны чылійскімі ўладамі на сярэдзіну студзеня міжнародны фестываль песні ў курортным горадзе Вінья-дэль-Мар ганебна праваліўся. З дапамогай гэтага, такога папулярнага ў гады ўрада Народнага адзінства, фестывалю чылійская ваеншчына разлічвала хоць крыху паслабіць унутраную і міжнародную ізаляцыю, у якой апынуўся фашысцкі рэжым Піначэта.

Дыктатар асабіста распарадзіўся, не лічачыся з выдаткамі, запрасіць у Вінья-дэль-Мар папулярных выканаўцаў. Стварылі прэс-цэнтр, зрабілі нацыянальныя флагі для ўдзельнікаў, нанава адрамантавалі залу, дзе павінны былі адбыцца выступленні спевакоў, але ўсе гэтыя прыгатаванні аказаліся непатрэбнымі. Фестываль сарваўся: ні адзін з запрошаных выканаўцаў не прыбыў у Чылі. Выдатны італьянскі спявак Клаўдзіа Віла ў інтэрв'ю газеце «Пазэе сера», у прыватнасці, заявіў:

«Я ніколі не спяваў і не буду спяваць для генералаў-путчыстаў і чылійскіх фашыстаў». Адмовіліся ўдзельнічаць у фестывалі і многія іншыя вядомыя артысты. Ніхто не пажадаў паехаць у краіну, дзе цяпер спальваюць на кастрах творы выдатных нацыянальных паэтаў Пабла Нэруды і Габрыэлы Містраль, кнігі Арыстоцеля і Гамера, Дантэ і Шэкспіра, Талстога і Дастаеўскага, Бальзака і Эксюперы.

Прагрэсіўная грамадскасць не забылася, што са спальвання помнікаў сусветнай літаратуры хунта пачала свой паход на культуру. Праз якіх тры тыдні пасля фашысцкага мяцяжу рэакцыйная ваеншчына апублікавала шырокі спіс кніг, якія належыць, як сказана ў дэкрэце, «знішчыць агнём». У сваім запале салдафоны дайшлі да кур'ёзаў. У дзяржаўным універсітэце была знішчана манаграфія аб кубізме: вандалам здалося, што слова «кубізм» звязана з рэвалюцыйнай Кубай. Ва універсітэце Антафагасты ў агонь была кінута навуковая праца «Рэвалюцыя ў кібернетыцы». Увесь свет скаланулі звесткі аб злачынстве інквізітараў у ваенных мундзірах: у горадзе Кансепсьён на кастры з кніг быў зажыва спалены чылійскі патрыёт Серхіа Іск'ерда.

«Кастры з кніг, якія гарэлі 40 гадоў назад у гітлераўскай Германіі,—гаварылася ў заяве, прынятай на другой сустрэчы прадстаўнікоў лацінаамерыканскага мастацтва ў Гаване, — палаюць цяпер у Чылі. На гэтых кастрах спальваюць тварэнні вялікіх паэтаў і пісьменнікаў. Фашысты ненавідзяць сусветную культуру».

Па загаду хунты ў горадзе Чыльян была сцёрта фрэска вядомага мексіканскага мастака Сікейраса. Яна ўпрыгожвала сцены і столь залы бібліятэкі ў школе, пабудаванай на сродкі мексіканскага народа ў падарунак жыхарам горада Чыльяна, які пацярпеў ад землетрасення ў 1938 годзе. Фрэска адлюстроўвала гераічную барацьбу індзейцаў і крэолаў за вызваленне ад каланіяльнага панавання.

Хунта знішчае не толькі творы мастацтва, але і яго дзеячаў. На сумленні чорных генералаў смерць вялікага паэта, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Пабла Нэруды, выдатнага народнага спевака і кампазітара Віктара Хары, дырыжора і кампазітара Хорхе Пенья. У засценкі кінуты мастак Педра Васкес.

Ад варварства хунты пацярпелі і навучальныя ўстановы. У самым пачатку мяцяжу фашысты падвергілі бамбардзіроўцы Дзяржаўны політэхнічны інстытут і іншыя навучальныя ўстановы. Захапіўшы ўладу, хунта замяніла кіраўніцтва ўсіх ВНУ, прызначыўшы на іх месца адстаўных генералаў і палкоўнікаў. Толькі за першы год фашысцкай дыктатуры на вуліцу былі выкінуты 11 тысяч настаўнікаў. Чысткі ва універсітэтах працягваюцца і зараз. Нават з самага «добранадзейнага» Каталіцкага універсітэта выгнаны 152 выкладчыкі.

На свой лад рэакцыянеры спрабуюць перарабіць і вучэбныя дапаможнікі. Піначэт забараніў студэнтам вышэйшых навучальных устаноў вывучаць гісторыю Чылі з 1891 па 11 верасня 1973 года, бо ў падручніках па гэтаму прадмету ўпамінаюцца падзеі непажаданыя хунце: першае масавае выступленне чылійцаў супраць іншаземных манаполій у 1891 годзе, перамога на прэзідэнцкіх выбарах у 1930 годзе кандыдата Народнага фронту. Нарэшце, асабліва не падабаецца Піначэту перыяд з 1970 па 1973 год, калі кіраваў краінай урад Сальвадора Альендэ. Міністр адукацыі контрадмірал Артуро Транкоса загадаў знішчыць падручнікі 5—6 і 7-х класаў па гісторыі і геаграфіі ў школах, ліцэях, каледжах.

Рэакцыйная ваеншчына імкнецца любой цаною вытравіць з памяці чылійскага народа ўсё прагрэсіўнае, распаўсюдзіць у краіне фашысцкую ідэалогію. Сумленныя людзі ўсяго свету кляймяць ганьбай крывавыя злачынствы клікі Піначэта, пратэстуюць супраць здзекаў з культуры і яе прадстаўнікоў.

А. МЯДЗВЕДЗЕНКА.
(ТАСС).

Поспехам карыстаецца ў Польшчы новы мастацкі фільм рэжысёра Януша Маеўскага «Праклятыя столікі» паводле вядомага ў перадваенныя гады рамана Міхала Хараманьскага, дзе праўдзіва і з сацыяльнай вастрынёй быў паказаны лёс «чалавека з рэстарана», афіцыянта. Як і іншыя персанажы, Генрык Воцэль трапляе ў своеасаблівы і страшны свет кракаўскага рэстарана «Гранд», праходзячы працэс пазнання грамадства.

На здымку: кадр з фільма.
З часопіса «Польское обозрение».

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Браніславу Спрынчану з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці жонкі Святланы Ляонцьеўны.

Рэдкалегія і калектыў супрацоўнікаў часопіса «Неман» выказваюць глыбокае спачуванне члену рэдкалегіі, рэдактару аддзела паэзіі, пісьменніку Браніславу Спрынчану ў сувязі з заўчаснай смерцю жонкі.

Калектыў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» выказвае глыбокае спачуванне паэту Браніславу Спрынчану з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці жонкі.

СУСТРЭЧЫ, ПОШУКІ, АДКРЫЦЦІ.

НЯЗГАСНЫЯ РАДКІ

●

З ПАПЕРЫ — НА ЭКРАН

●

МАРШРУТ ЗАМЕЖНЫХ ГАСТРОЛЯЎ

ДАРОГІ «КАЛАСКА»

Агітбрыгада «Каласок» Добрушскага РДК мастацкімі сроднамі дапамагае хлебаробам і жывёлаводам раёна паспяхова змагацца за выкананне сацыялістычных абавязацельстваў. Аб поспехах працаўнікоў сяла на перадз'ездаўскай вахце расказвае ў гэтыя дні новая праграма агітбрыгады. Называецца яна «Партыі, з'езду — наш працоўны рапарт».

Маршруты агітбрыгады праляглі ва ўсе населеныя пункты раёна. Ёй апладзіравалі хлебаробы калгасаў імя Калініна, «Абарона», імя 50-годдзя СССР, «Шлях да камунізму» і іншых гаспадарак.

Сярод удзельнікаў агітбрыгады — рабочы будаўніча-мантажнага ўпраўлення А. Захараў, работніца цэлюлозна-папяровага камбіната «Герой працы» Н. Кавалёва, навучэнцы ГПТВ В. Шкадун, В. Малашанка і іншыя аматары сцэнічнага мастацтва.

М. ІПАЛІТАЎ.

БАЛЕТ ПАЕДЗЕ Ў ПОЛЬШЧУ

У Варшаве падпісан пратакол аб гастролях балетнай трупы Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР у брацкай Польшчы.

Беларускія артысты выедуць за рубеж у маі і правядуць у Варшаве, Вроцлаве, Забжэ і Лодзі больш чым паўмесяца. Там яны пакажуць жамчужыну класічнай харэаграфіі «Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага аднаактовыя балеты «Кармен-сюіту» і «Камерную сюіту» Р. Шчадрына, «Альпійскую баладу» Я. Глебава, «Шапеніяну» і класічны акт з балета Л. Мінкуса «Баядэрка». Плануецца таксама паказ балета «Стварэнне чалавека» на музыку Андрэя Пятрова, які ставіць цяпер галоўны балетмайстар тэатра В. Елізар'еў.

Маючыя адбыцца гастролі, на якія балетная трупа паедзе разам з аркестрам тэатра, яшчэ больш умацуюць традыцыйныя творчыя кантакты беларускіх і польскіх артыстаў, сяброўскія сувязі нашых народаў.

БЕЛТА.

ЦЕСНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Саюз пісьменнікаў здаўна падтрымлівае цесныя сувязі з Міністэрствам унутраных спраў БССР. У выніку гэтага ў свет з'явілася нямала мастацкіх твораў, у якіх паказаны вобраз чалавека, што ахоўвае сацыялістычны парадак, расказваецца аб мужных справах міліцыі і не вялікай рабоце па прадухіленню злачынасці і перавыхаванню асобных людзей, што пераступілі нашы савецкія законы.

9 лютага ў клубе Упраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкома адбылася сустрэча работнікаў міліцыі з пісьменнікамі П. Кавалёвым, М. Гамолкам і А. Капусцiным. Яе адкрыў начальнік упраўлення УС Мінскага аблвыканкома генерал-маёр Г. В. Пукаў. П. Кавалёў расказаў прысутным аб тым, як беларускія пісьменнікі рыхтуюцца сустрэць XXV з'езд КПСС, якія творы яны прысвяцілі гэтай гістарычнай падзеі ў жыцці Савецкай краіны.

СЦЕЖКАМІ ПАМЯЦІ

Пасылка Валянціна Таўлая

Ішоў 1931 год. Перад першамайскім святам нас, некалькі рэвалюцыйна настроеных юнакоў, паліцыя арыштавала для «прафілактыкі», каб не расклейвалі лістовак, не распаўсюджвалі адозваў. Праз дзень нас выпусцілі. А праз некаторы час з паштовага агенцтва паведамілі, што на маё імя прыйшла пасылка. Падумалася, што гэта падвох паліцыі. Да таго ж, напярэдадні, калі быў на рэгістрацыі ў пастарунку, бачыў паштовую работніцу. Аднак яна ні пра якую пасылку не гаварыла.

І вось падаю ў акенца паведамленне. Загадчыца агенцтва пытаецца, хто ёсць у мяне са сваякоў у Савецкім Саюзе. Кажу, што нікога. А хто такі Таўлай? Адказваю, што мы добра знаёмы, разам вучыліся.

— Ён прыслаў вам кнігі.

Побач знаходзіўся пастарунак, і я хутчэй накіраваўся ў лес, каб ніхто не заўважыў пасылку. Збочыўшы з дарогі ў хмызняк, пачаў разглядаць літаратуру. Кніг было сем, у тым ліку «Дзесяць дзён, якія скалыхнулі свет» Дж. Рыда, «Цэмент» Ф. Гладкова, зборнік вершаў «Лукішкі» Алеся Салагуба. Я быў, як кажуць, на сёмым небе. Радаваўся за А. Салагуба, які вырваўся з кіпцюроў дэфензівы, і, вядома, што атрымаў кнігі.

Пасля таго, як паліцыя канфіскавала ў Чамярах бібліятэку-чытальню імя Якуба Коласа, з літаратурай было вельмі цяжка. Праўда, можна было запісацца ў якую-небудзь бібліятэку ў Слоніме, але там бралі плату, а грошы былі не ў кожнага.

Прысланыя кнігі прачыталі ўсе мае сябры.

...Прайшло больш чым сорак гадоў. Цяпер у Чамярах, як і ў многіх вёсках Слонімшчыны вялікая сельская бібліятэка. У ёй — творы многіх пісьменнікаў, сярод іх — Ф. Гладкоў, Дж. Рыд, В. Таўлай.

А нядаўна маланкай прыляцела навіна: на адным з хутароў пры разборцы старой хаты ў саламянай страсе знойдзены зборнік вершаў А. Салагуба «Лукішкі». Кніжачка даволі добра захавалася. Цяпер яна экспануецца ў Слонімскім краязнаўчым музеі.

Хто схаваў зборнік у страсе, цяжка сказаць. Пэўна, нехта з падпольшчыкаў. А што гэта іменна той экземпляр, які прыслаў В. Таўлай, ёсць прыкмета: маёй рукой зроблена праўка аднаго радка верша.

Твор некалі пачынаўся так: «Я не буду грудзьмі надрывацца, што памру за цаглянай сцяной», а ў зборніку надрукавана: «што памру ў вязніцы сырой». Тады я вярнуў вершу ранейшае гучанне, да якога мы прывыклі, чытаючы твор у заходнебеларускім друку.

І вось я зноў перачытваю бясхітрасныя, поўныя аптымізму і веры ў светлае будучае, вершы. Такое ўражанне, што сустрэўся з самім аўтарам.

Анатоль ІВЕРС.

Слонім.

Сувеніры з ільновалакна, якія выпускае Маладзечанская фабрыка мастацкіх вырабаў, карыстаюцца папулярнасцю і ў нашай краіне, і за мяжой. Іх закупляюць фірмы Японіі, Канады, Партугаліі, Англіі, Швецыі. Толькі летась маладзечанскія сувеніры пабывалі на міжнародных выстаўках у Лісабоне, Познані, Манрэалі. Іх выпуск у дзесятай пяцігодцы значна ўзрасце.

На здымку: стваральнік сувеніраў з ільновалакна — мастак фабрыкі Раіса Брысюк.

Фота Ч. МЕЗІНА. (БЕЛТА).

МАСКОЎСКАЯ ПРЭМ'ЕРА

У маскоўскім кінатэатры «Мінск» прэм'ерай беларускай стужкі «Час яе сыноў» пачаўся паказ фільмаў пад дэвізам «Да новых вышынь будаўніцтва камун'зму». Перад гледачамі выступілі рэжысёр-пастаноўшчык карціны В. Тураў, выканаўцы галоўных роляў артысты Ю. Гарабец і А. Лазараў, кампазітар А. Янчанка.

У фае кінатэатра адкрылася фотавыстаўка, якая расказвае аб поспехах працоўных Беларусі ў брацкай сям'і савецкіх народаў.

БЕЛТА.

ДЛЯ АМАТАРАЎ КНІГІ

У Светлагорскім Палацы культуры хімікаў адбыўся кніжны кірмаш-выстаўка, арганізаваны гарадскім аддзелам культуры і таварыствам кнігалюбаў. Залу палаца запоўнілі шматлікія аматары кнігі. Вялікім попытам карысталіся творы класікаў рускай літаратуры — А. Талстога, А. Пушкіна, М. Горкага, вядомых замежных пісьменнікаў. На кірмашы шырока былі прадстаўлены кнігі беларускіх пісьменнікаў.

Загадчыца гарадскога аддзела культуры Л. Бондарава прачытала лекцыю: «Роля кнігі ў камуністычным выхаванні чалавека». Быў паказаны кінафільм.

М. ЛЮНДЫШАЎ.

ТУТ СТВАРАЮЦЦА МУЛЬТФІЛЬМЫ

Адзін здымачны павільён на «Беларусьфільме» мала чым нагадвае кінавытворчасць наогул. Замест велізарных «дзігаў» і мініяцюрных «бебікаў» — розныя крэслы, чарцёжныя сталы; пахне фарбамі, ватманскай паперай. А на сценках — цэлюлозныя планшэты, на якіх квяцістыя адпостраванні ваўкоў, жабаў, казлят і нават... забаўнага осліка.

І ўсё ж такі мы не памыліліся. Гэта — павільён. Тут робяцца фільмы. Праўда, не дакументальныя або мастацкія, а маляваныя, лялечныя, ці прасцей кажучы, — мультыплікацыйныя, тыя «мульцікі», якія так любяць і малыя, і дарослыя.

Шчыра кажучы, «мульцікі» для беларусьфільмаўцаў не з'яўляюцца чымсьці новым. На працягу пяці гадоў на экранах кінатэатраў і тэлебачання дэманструецца некалькі стужак, зробленых рэжысёрамі Уладзімірам Голікавым, Уладзімірам Піменавым і Львом Шукалюкавым. І ўсё ж у беларускіх майстроў маляванага фільма сённяшні дзень не зусім звычайны — ён стаў днём нараджэння вытворча-творчай майстэрні мультыплікацыйных фільмаў.

— Безумоўна, — гаворыць рэжысёр Уладзімір Голікаў, — што стужкі нашага жанру можна ствараць і ў адзіночку. Але толькі ў творчай садружнасці з калегамі, аб'яднанымі ў адну творчую групу, магчыма рабіць іх на высокім мастацка-выканаўчым узроўні. Вось гэтага нам раней вельмі не хапала. І толькі цяпер, калі на «Беларусьфільме» атрымала права на існаванне вытворча-творчая майстэрня, для кожнага з нас адкрылася новыя магчымасці ў большай ступені ажыццявіць свае задумы.

Раней, пачынаючы работу над фільмам, пастаноўшчыку даводзілася не толькі падбіраць мастаноў - мультыплікатараў, аператараў, але, і шукаць дабротны, гатовы да вытворчасці сцэнарый. Цяпер жа гэтую функцыю на сябе возьме мастацкі савет майстэрні, які мае час папрацаваць са сцэнарыстам, прадумаць і скласці перспектыўны план...

Трэба сказаць, што Уладзімір Голікаў найбольш дакладна і ёмка выказаў настрой усяго, хоць і невялікага, але ініцыятыўнага калектыву мультыплікатараў. Мне памятаецца, якія цяжкасці даводзілася пераносіць Уладзіміру і яго таварышам у час падрыхтоўкі і здымкаў першых беларускіх мультфільмаў — «Вася Буслік і іншыя», «Няўдачнік», «Хлопчык і птушка» і іншыя. Замест таго, каб вырашаць чыста творчыя пытанні, кінематаграфістам даводзілася «ламаць галаву» над тым, дзе дастаць патрэбныя матэрыялы, фарбы, кінакамеру...

Цяпер жа ўсё будзе па-іншаму. І таму можна толькі радавацца за нашых мультыплікатараў.

— У тым, што за апошнія гады мультыплікацыйныя стужкі сталі карыстацца вялікай папулярнасцю, — гаворыць Уладзімір Голікаў, — сумнявацца не даводзіцца! Творы гэтага вясёлага і дасціпнага жанру кінамастацтва па душы, як дзецям, так і дарослым. І многім хочацца не толькі глядзець, але і самім удзельнічаць у іх стварэнні.

Даўно супрацоўнічаюць з беларускімі мультыплікатарамі кампазітары Сяргей Картэс і Эдуард Ханок, які, дарэчы, нядаўна напісаў цудоўную песеньку вясёлых жабянят для маляванай стужкі «Квака-задавака». Яшчэ не паспеўшы прагучаць з кінаэкрана ў выкананні папулярнага ансамбля «Песняры», яна вельмі палюбілася, напрыклад, удзельнікам Фестывалю балгара-савецкай моладзі ў Мінску.

Вядома, арганізацыйна ўсё гэта выглядае часам не зусім эфектна: мы збіраемся разам — рэжысёры, сцэнарысты, мастакі, аператары, кампазітары. Пачынаем «марыць»: а што, калі зрабіць гэтак або так, калі звязаць той сюжэт з гэтым... Нараджаецца задума...

Паводле прынятага мастацкім саветам плана, ствараем селета дзве стужкі, адна з якіх — «Касец-волат» ужо запушчана ў вытворчасць. Яе здымаюць рэжысёр Леў Шукалюкаў і мастак Яўген Ларчанка. У аснову сцэнарыя, напісанага маладым літаратарам Галінай Карпавай і вопытным кінааператарам Георгіем Удавенкавым, пакладзены матывы беларускіх народных казак. Рыхтуецца да запуску ў вытворчасць і другая стужка — «Курган» паводле аднаіменнай паэмы Янкі Купалы. Мяркуем прыцягнуць да ўдзелу ў сцэнарных распрацоўках пісьменнікаў, якія ведаюць спецыфіку казачнага жанру і маюць вопыт супрацоўніцтва з тэатрам — Васіля Вітку, Алену Кобец-Філімонаву, Анатоля Вярцінскага, Петруся Макаля. Спачатку будуць пераважаць стужкі, створаныя па матывах беларускага фальклору. У ім мы бачым нямала сюжэтаў як для дарослых, так і для дзіцячых фільмаў...

Біяграфія беларускай мультыплікацыі пачалася.

С. ВІКТОШЫН.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 22-96-53, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Хведар ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Барыс БУР'ЯН, Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Ігар ДАБРАЛЮБАЎ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЕД, Віктар ПРАТАСЕНЯ, Іраіда САНКОВА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО, Віктар ШЫМУК (адказны сакратар), Рыгор ШЫРМА.

Індэкс 63856 АТ 01073